ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР.

№ 24 (1558) | Пятніца, 24 сакавіка 1961 года | Цана 4 кап.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

аб выніках выбараў у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Саветы дэпутатаў працоўных Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі

(Даныя аб выніках выбараў публікуюцца на падставе матэрыялаў, атрыманых Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР ад выканаўчых камітэтаў абласных і Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў працоўных)

19 сакавіка 1961 года ў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы адбыліся выбары ў абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Саветы дэпутатаў працоўных.

Выбары ў мясцовыя Саветы Беларускай ССР прайшлі ў абстаноўцы вялікага палітычнага ўздыму, выкліканага рашэннямі студзеньскага Пленума ЦК КПСС аб скліканні XXII з'езду Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і аб мерапрыемствах па далейшаму развіццю сельскай гаспадаркі.

Галасаванне ўсюды пачалося ў 6 гадзін раніцы, закончылася ў 12 гадзін ночы і праходзіла ў строгай адпаведнасці з выбарчым законам. Выбары прайшлі пры высокай актыўнасці і арганізаванасці выбаршчыкаў, пад знакам маналітнага адзінства блоку камуністаў і беспартыйных, адзінства і згуртаванасці працоўных Беларускай ССР вакол Камуністычнай партыі і Савецкага урада.

Выбраны дэпутаты ў 6 абласных Саветаў, 131 раённы Савет, 69 гарадскіх Саветаў, 11 раённых Саветаў у гарадах, 1.592 сельскія Саветы і 127 пасялковых Саветаў.

Пры выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Саветы дэпутатаў працоўных прынялі ўдзел у галасаванні:

	Агульная колькасць выбаршчыкаў	Колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні	
		у абсалютных лічбах	у працэнтах
У абласныя Саветы	5.249.529	5.246.619	99,94
У раённыя Саветы	4.024.542	4.023.811	99,98
У гарадскія Саветы	1.528.234	1.526.436	99,88
У раённыя Саветы ў гарадах	611.180	610.169	99,83
У сельскія Саветы	3.297.406	3.295.835	99,95
У пасялковыя Саветы	346.728	346.632	99,97

З агульнай колькасці выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні, за кандыдатаў блоку камуністаў і беспартыйных прагаласавала:

	Колькасць галасоў, пададзеных за кандыдатаў	Працэнт да ліку выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні
У абласныя Саветы	5.238.308	99,84
У раённыя Саветы	4.016.748	99,82
У гарадскія Саветы	1.521.796	99,70
У раённыя Саветы ў гарадах	608.066	99,66
У сельскія Саветы	3.286.221	99,71
У пасялковыя Саветы	345.838	99,71

Колькасць бюлетэняў, у якіх закрэслены прозвішчы кандыдатаў, гэта значыць, колькасць галасоў, пададзеных супраць кандыдатаў у дэпутаты, складае: па выбарах у абласныя Саветы — 8.266, або 0,16 працэнта; у раённыя Саветы — 7.053, або 0,18 працэнта; у гарадскія Саветы — 4.619, або 0,30 працэнта; у раённыя Саветы ў гарадах — 2.096, або 0,34 працэнта; у сельскія Саветы — 9.585, або 0,29 працэнта; у пасялковыя Саветы — 794, або 0,23 працэнта.

На падставе артыкула 99 «Палажэння аб выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Саветы дэпутатаў працоўных Беларускай ССР» 112 бюлетэняў прызнаны несапраўднымі.

Такім чынам, вынікі галасавання паказваюць, што выбаршчыкі аднадушна галасавалі за кандыдатаў блоку камуністаў і беспартыйных.

Ва ўсе мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных Беларускай ССР выбрана 78.077 дэпутатаў. У ліку дэпутатаў 31.583 жанчыны, або 40,45 працэнта, 33.962 члены і кандыдаты ў члены КПСС, або 43,50 працэнта, 44.115 беспартыйных, або 56,50 працэнта, рабочых з вытворчасці і калгаснікаў 46.925, або 60,10 працэнта.

Па 13 выбарчых акругах па выбарах у сельскія Саветы кандыдаты, якія балаціраваліся, не атрымалі абсалютнай большасці галасоў і не былі выбраны дэпутатамі.

Ва ўсіх гэтых акругах у адпаведнасці з «Палажэннем аб выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Саветы дэпутатаў працоўных Беларускай ССР» адбудуцца новыя выбары.

ГЕРОІ НАШЫХ ДЗЁН

Агонь душы

Раман САБАЛЕНКА

МО' ТАМУ, што мы з Аленай Данілаўнай Паньковай людзі аднаго веку, у нас і гаворка неяк адразу склеілася. Да вайны я доўгія гады пражыў у Гомелі і мне, відаць, не раз даводзілася хадзіць тымі сцежкамі, па якіх хадзіла і яна. Знайшлося многа агульных знаёмых, і калі мы іх успаміналі, дык адразу знікала тая адчужанасць, якая звычайна вымушае малазнаёмых людзей шукаць у гаворцы тое, што само ляжыць на паверхні і відно ўсім. Жвавая, можа, нават ужо і не па гадах увішная, Алена Данілаўна, неяк сцепанулася, як бы скінула з сябе цяжар пражытага і перажытага, і сказала:

— А вы ведаеце, я цяпер як бы ўзыйшла на самую вяршыню гары, з якой відно не толькі тое, што пройдзена, але і відаць тыя далягляды, да якіх трэба абавязкова дайсці. Брахню гэта кажуць, што бабін век — сорак год. Мусіць, гэта выдумаў чалавек, якому не хацелася ні самому жыць, ні другіх бачыць у красе. Жыццё чалавечае, чым яно багацейшае вопытам, тым яно паўнейшае інтарэсам, — па-філасофску заключыла Панькова.

І гэта сапраўды так.

ЧАСАМ успамінае яна...

Рыпучыя колы бежанскай фурманкі мелюць жарству дарогі, якая вядзе немаведама куды. Ззаду, недзе там за Лунінцом, нема вухкаюць гарматы. Машынёт Лунінецкага дэпо ўцякае ад вайны, ад нямецкай навалы. Увесь яго скарб умяшчыўся на возе: там ляжыць невялікі мех сухароў, сякіятакія транты. Самае дарагое — дзеці. Яны вельмі яшчэ малыя і не разумеюць куды і навошта іх вязуць. Для іх гэта нават цікава, бо вунь Аленка пытае ў маці:

— Мама, гэта мы ў госці едзем?

Ганна Іванаўна за гэтыя дні, што яны ў дарозе, неяк пастарэла, нават прыгорбілася. На вочы яе раз-пораз набягае сляза, хоць яна і стараецца хаваць яе, каб ніводнае з чацвярых дзяцей, што сядзяць на возе, не ўгледзела яе роспачы. Жанчына стараецца не паказаць і віду, што яе сэрца аж разрываецца ад болю. Маці як мага спакайней адказвае:

— Але, дачушка, у госці.

— Дык чаму так далёка?

— Таму што не блізка, — не знайшлася што адказаць Маці.

Бежанцаў першай імперыялістычнай вайны невядомая дарога прывяла спачатку ў Бранск. Потым куды жыццё толькі не кідала іх. Нарэшце асталяваліся ў Гомелі. Алена нібы ў сне і цяпер яшчэ ўспамінае, як яна з бляшаначкаю ў руках стаяла ў чарзе ля нейкага чырвонага будынка, чакаючы бежанскага крупніку. Аднаго разу маці паслала яе і большую сястру Ганну атрымаць бежанскі паёк хлеба. Яны аж пасварыліся, каму несці тую лустачку чорнага хлеба, які ім выдалі па картцы. Ганна аддала хлеб Аленцы, але не зводзіла вачэй з яе рук, каб, барані божа, тая не ўпусціла хлеба. А Аленцы гэтак хацелася хлеба, і яна неўзаметку ад сястры ўшчыкнула крошачку і ўкінула ў рот. О, які ён смачны быў той хлеб. Здаецца і цяпер, калі пражыта ўжо столькі год, пабачана столькі ка вяку, Алена нічога ніколі смачнейшага не ела. А Ганна ўгледзела ўсё-такі, што сястрычка не ўтрымалася ад спакусы і сама, вырваўшы з Аленчыных рук акрайчык, пачала адшчыкваць крошкі. Гэтак яны тады і не данеслі хлеба дадому. Калі маці спытала: а дзе ж хлеб?—Ганна хацела выдумляць, што яны згубілі акрайчык, але Аленка не магла зманіць маці.

— Мамачка, ён гэткі смачны быў...

Дзяўчынка чакала, што маці калі не наб'е, дык насварыцца на іх, бо ў хаце не было што і на зуб пакласці, а сям'ю ж трэба было нечым карміць. Але маці не набіла і не насварылася, яна толькі адвярнулася і ціхенька запрычытала:

— Дзетачкі мае, галубянятачкі мае, што ж мне з вамі рабіць. Чаго гэткая доля няшчасная вам на раду выпала.

І яшчэ запомнілася Алене, як у дваццатым годзе ляжаў на лаве бацька ў збітай з негабляваных дошак труне. Усе галасілі, а яна спалохаными здзіўленымі вачыма глядзела на бацьку. Ёй здалося, што ён нават падрос. Адно дзівіла, чаго над ім плачуць. Ён жа вунь зараз прачнецца, устане з гэтай вузкай скрыні і скажа, як казаў заўсёды, калі ў хаце быў вэрхал:

— Годзе вам, раскудакаліся, як тыя куры на седале.

Потым бацьку выносілі з хаты, ставілі труну на воз і некуды везлі. Яна не хадзіла за тым возам, аставалася дома і ёй доўга яшчэ, аж пакуль яна не навучылася разумець усяго, здавалася, што бацька вось-вось вернецца дахаты.

Якое б гора на чалавека ні зрынулася, ён заўсёды пераможа яго, калі толькі ў гэтага чалавека ёсць воля да перамогі. І Аленіна маці Ганна Іванаўна перамагла цяжкія нягоды жыцця. Яна сама пайшла працаваць у паравозвае дэпо і працавала так, што мужчыны каторыя зайздросцілі яе ўмельству і спрыту. У 1924 годзе Ганна Панькова ўступіла ў вялікую сям'ю камуністаў, стала членам партыі. Мо' таму, што самое яе жыццё ніколі не песціла, яна і са сваіх дзяцей не старалася рабіць беларучак. Сама не баючыся ніякай працы, зведаўшы на вяку па чым фунт ліха, Панькова старалася і дзяцей прывучыць, каб яны не гнуліся, не падалі ні пад якім цяжарам. Калі Аленка ў 1930 годзе скончыла пяць класаў, маці ёй гэтак і сказала:

— Ведаешь дачухна, у нашым родзе-заводзе не было ніколі ні прафесараў, ні дактароў: бацька твой быў машыністам, я, як бачыш, работніца, то хачу, каб і ты не баялася крывавага мазаля.

Тады ж Алена і стала вучаніцай школы фабрычна-заводскага навучання, якая рыхтавала маладых рабочых для прадпрыемстваў чыгункі.

Яшчэ і цяпер, калі Алена Данілаўна праходзіць паўз двухпавярховы будынак з вялізнымі вокнамі, што поруч з Палацам культуры імя Леніна, дык сэрца яе аж ёкае. У памяці яе ўстае рабочае юнацтва. Чамусьці адразу ўспамінаецца смешнае: яе ў школе нават не хацелі лічыць за дзяўчынку. Хлопец дый годзе, адно толькі, што ў сукенцы. Гэткая яна была ўвішная, празарытая. Настаўнікі казалі, хоць ты яе да парты прышпільвай. Не вельмі далюблівала тэарытычныя дысцыпліны. Затое, калі вучняў вадзілі на практыку на паравоза-вагонарамонтны завод, дык там Алене і раўні не было. З ціскамі, з напільнікамі яна ўпраўлялася лепш за хлопцаў. Як бы ў Алены ў самой крыві было нешта рабочае, нешта такое, што цягнула яе, вабіла ў грукат металу, і яна ўяўляла сваю будучыню не інакш, як звязанай з машынамі, з гэтымі на выгляд суровымі, а ў сапраўднасці вельмі чулымі, дружнымі людзьмі рабочага калектыву.

Алене Паньковай яшчэ тады, калі яна са школы хадзіла на завод, у вагоннае і паравозвае дэпо, наломлівалася на работу, чамусьці кінулася ў вочы электразварка. Яна падоўгу прастойвала ля рабочага месца электразваршчыка, і той, хто трымаў у руках блакітнае полымя, здаваўся ёй чалавекам з нейкай казкі, а той шчыток, якім чалавек прыкрываў свой твар, надаваў яго постаці нешта велічнае, асіпкавае. Аленка не ўтрымалася ад спакусы падыйсці да электразваршчыка і папрасіць:

— Дзядзечка, дайце мне патрымаць гэты агонь.

— Ён жа балюча кусаецца. Табе яго нельга браць.

— Можна, можна! — запярэчыла Аленка.

Дзядзечка, вядома, тады не даў Аленцы ў рукі чарадзейнага агню. Але з таго часу, што б ні рабіла Панькова, у яе перад вачыма палыхала блакітнае полымя электразваркі. Вечарамі яна выходзіла з дому, садзілася на лавачку ля паркана і глядзела на вялізныя гмахі паравоза-рамонтнага. Над адным з карпусоў, што быў пад шкляным дахам, заўсёды ўвечары палыхалі блакітныя бліскавіцы. Алена думала пра тое, як бы на яе паглядзелі, калі б яна магла сваімі рукамі пусціць такую бліскавіцу. Цяпер ёй цяжка нават зразумець, чаго ў тым жаданні было больш: ці простай дзіцячай дапытлівасці, ці імкнення неяк вызначыцца, нечым яркім, як тая электразварка, бліснуць. Аднак з цягам часу, калі Алене трэба было ўжо выбіраць сабе дарогу ў рабочым страі, ёй гэтак захацелася стаць электразваршчыцай.

Пасля сканчэння школы ФЗН большасць яе выпускнікоў паслалі слесарамі ў Гомельскае вагоннае дэпо. Сярод іх была і Алена Панькова. Гэта быў час, калі наша краіна набіралася індустрыяльнай сілы, выконваючы свае першыя пяцігодкі. Чыгуначны транспарт быў тым нервам, ад работы якога ў значнай ступені залежаў поспех будаўніцтва сацыялізма. Перавозкі раслі і раслі, усё больш і больш патрэбна было вагонаў, а чым больш іх было на лініях, тым больш выходзіла са строю, станавіліся, як кажуць чыгуначнікі, хворымі. Панькова ўсюды паспявала са сваім слясарным інструментам. Кожную работу маладая работніца старалася рабіць добра. Аднак ёй карцела не тое, што яна рабіла, а тое, да чаго імкнулася юначае сэрца. Амаль кожны раз пасля сканчэння змены дзяўчынка аціралася ля электразваршчыкаў. Прыглядалася, як яны працуюць. Аднаго разу электразваршчыкі некуды адвярнуліся ад сваіх апаратаў і Алена як там была: яна хуценька кадзела ахоўны шчыток і хацела ўжо ўключыць апарат. Але дужая рука схапіла яе за каршэнь, і Алена пачула:

— Я от табе як прывару гэтага плескача, — рабочы замахнуўся дужаю рукою, — дык ты і дзесятаму закажаш больш не лезці да апаратаў.

На Аленіны вочы накаціліся слёзы.

— Дзядзечка, дазвольце хоць у руках патрымаць.

— Навошта? Гэта ж табе не цацка якая.

— Хачу электразваршчыцай стаць.

— Ты вунь смаркачы ўтры ды крупнік навучыся варыць і хопіць.

Аленка толькі скоса зірнула на электразваршчыка: маўляў, які ты нядобры дзядзька. Той скмеціў яе позірк і ў адказ на яго ўсміхнуўся. У дзяўчынкі аж на душы адлегла: значыць, ён не сур'ёзна, а толькі так, для прыліку накрычаў на яе.

Электразваршчыкі заўважылі, што кожны раз, як толькі ў іх перапынак у рабоце, ля апаратаў паяўляецца дзяўчынка, спрабуе нешта ўключаць. Нехта з іх, каб адвучыць настырную дзяўчынку, даўмеўся зняць з апарата ізаляцыйную ручку. Аднаго разу Аленка падбегла да апарата, уключыла яго. Яе гэтак трасянула токам, што ледзь не самлела. Электразваршчыкі, пазатульваўшыся за вагонамі, цікавалі, што будзе рабіць дзяўчынка. Аленка, спалоханая пабегла да свайго рабочага месца. Думалі, што больш ніколі гэтае дзяўчо не падыйдзе да электразваравчых апаратаў. Але ніхто не ведаў з іх, што ў Алены Паньковай гэта была не простая дапытлівасць. Гэта была, можа яшчэ не ўсвядомленая, мэта яе рабочага жыцця.

Адзін час у дэпо не стала слясарных работ. Маладых слесараў каго паслалі праваднікамі, а каго на розныя іншыя работы. Панькова пайшла тады да самога начальніка дэпо і катэгарычна заявіла:

— Хачу быць электразваршчыцай. Як сабе хочаце, але ні на якую іншую работу я не пайду.

Начальнік дэпо зірнуў на дзяўчыну з нейкай паблажлівай усмешкай.

— Электразваршчыцай, кажаш, і больш нікім! Цікава, цікава! Адкуль у цябе гэтакі спрыт хлапечы?

— Я люблю гэтую работу, — выпаліла Алена.

— Як жа ты можаш любіць, калі ты яе не рабіла?

— Рабіла! Я кожны дзень гляджу, як электразваршчыкі працуюць. У мяне душа гарыць да гэтай работы.

— Ну, калі душа гарыць, то паспрабуй, хоць гэта і мужчынская работа, — згадзіўся начальнік і адразу ж узяўся званіць па тэлефоне.

На званок доўга ніхто не адказваў. Мусіць, шукалі брыгадзіра электразваршчыкаў Васіля Жарына. Алена ведала ў твар гэтага ніцага, заўсёды пахмурага чалавека. Яна не аднойчы прасіла яго, каб дазволіў хоць трошкі папрактыкавацца. Ён зыркаў на яе спадылба і цыкаў, як на тое кацянё, што ўвязалася за чалавекам. Ажыла трубка, і Алена пачула:

— Таварыш Жарын, ты вазьмі да сябе гэтую дзяўчыну Панькову. Падвучыце, можа з яе што і выйдзе.

Алене хацелася крыкнуць: выйдзе! выйдзе! Але яна змоўчала, чакаючы, што адкажа начальніку Жарын. Вельмі доўга, як здалося Алене, начальнік маўчаў, слухаючы Жарына. І хоць яна не чула, што казаў Жарын на другім канцы провада, яна ўяўляла сабе выраз яго твару, збянтэжанасць і, здавалася, чула, што той казаў: «У мяне ж не інстытут для красунь, а брыгада электразваршчыкаў. Ніколі ж яшчэ мо' на ўсім свеце не было, каб жанчына трымала ў руках электразварачны апарат». Начальнік, выслухаўшы Жарына, казаў:

— Дармо ты так думаеш, таварыш Жарын. Адсталыя ў цябе погляды на жанчыну. Дамастроеўскія, можна сказаць. Вазьмі, вазьмі. Мне здаецца, не пашкадуеш. Як той казаў, купіў не купіў, а патаргавацца можна.

Алене ён сказаў:

— Дык ты от што, дзяўчо, калі вельмі хочаш, дык ідзі да Жарына. Толькі глядзі, каб не падвяла мяне. Ты ж чула, я паручыўся за цябе.

— Дзякую, дзякую! Не падведу! — і подскакам выбегла з кабінета.

Дома Алена расказала маці пра свой намер, пра тое, што хадзіла да начальніка дэпо, і Ганна Іванаўна, зірнуўшы на меншую дачку, толькі як бы цяпер упершыню заўважыла, што Аленка яе ўжо дарослая, і яшчэ сама сабе падумала, што такая як Аленка, нідзе не прападзе, што яна ў жыцці свайго даможацца. Маці нават адчула гонар за тое, што адна, без бацькі, выхавала ў дачкі такія добрыя чалавечыя якасці. Але пра гэтыя свае думкі не сказала ні слова, адно толькі пацалавала дачку і вымавіла:

— А ты ўжо вырасла, дачушка мая.

Сказала і слёзы накаціліся на вочы, быццам ёй шкада стала дочынага дзяцінства. А мо' сваёй маладосці?..

ВЯСНА была ў самай красе. Адшугала пялёсткавая замяць у садах. Дрэвы густа выкінулі зялёны ліст, а зямля, дзе толькі яе не ўтапталі, не ўтрамбавалі нагамі, выгнала зялёную мураву. У тую нядзелю на стадыёне чыгуначнікаў было людзей, як на добрым кірмашы. Чуліся песні, залівісты смех. Весялосць не ведала ўпынку. Рыхтавалася цудоўнае відовішча. Выступалі лёгкаатлеты Беларускай чыгункі. Алена Панькова была ў складзе валейбольнай каманды. Смелая, настойлівая ва ўсім, яна і ў спорце не хацела быць апошняй. У часе гульні кідалася на мяч, брала такія мячы, якіх, здавалася, ніхто не мог узяць. На гэты раз Панькова асабліва старалася: як-ніяк трэба было абараніць гонар дэпоўскай каманды.

Панькова гуляла прыгожа. Яна неўзаметку наглядала за публікай і бачыла, што позіркі многіх «балельшчыкаў» скіраваны на яе. Чамусьці кінуўся ў вочы чарнявы хлопец у спартыўнай форме, які ўсё глядзеў і глядзеў на яе. Захацелася зрабіць нешта такое гарэзлівае, каб здзівіць таго чарнявага. Праз сетку ляцеў такі мяч, якога мо' ніхто ніколі не браў. Алена наважыла абавязкова яго ўзяць: няхай здзівіцца той хлопец, які нават здаля нечым спадабаўся ёй. Спартсменка кінулася на мяч, каб выцяць яго і паслаць цераз сетку. Але не яна, а мяч выцяў яе з такой сілай, што яна на момант страціла прытомнасць і потырч паляцела на зямлю. Апрытомнела Алена на руках у таго чарнявага хлопца. Ён трымаў яе, як нешта вельмі дарагое, баючыся, каб яно не ўпала з рук і не разбілася на друзачкі.

— Дзе вы жывяце? — дапытваўся хлопец. — Я вас дадому данясу.

— Ой, што вы! Не трэба! Не трэба! Я яшчэ гуляць буду. Сама дайду, калі трэба будзе, — запратэставала Алена і памкнулася стаць на ногі.

Але закружылася галава і яна зноў ледзь не ўпала.

— Я вас даваду. Дзе вы жывяце?

Саромеючыся, Алена сказала свой адрас і, кульгаючы, курчачыся ад болю, паклыпала дадому. Каб хлопец дужымі рукамі не падтрымліваў яе, дык наўрад ці і дайшла б.

На парозе спахапілася, што хлопец аж у хату прыйшоў з ёю. Зірнула на маці і аж загарэлася ад сораму.

— Пазнаёмся, мама. Гэта... гэта.., — хацела сказаць, хто гэта, але сама не ведала, што ён за такі.

— Іван Назарэнка, рабочы з электратэхнічнага, — працягнуў для знаёмства руку хлопец. — Даруйце, што ўварваўся ў вашу хату, але ж ёй вельмі цяжка было, — выдаў Аленін сакрэт хлопец, бо сама яна нізавошта не прыналася б маці, што з ёй здарылася. Маці не вельмі спагадліва адносілася да дочынага захаплення спортам.

Але як бы там не было, а з таго дня Іван Назарэнка стаў як бы ценем Алены Паньковай. Па настаянню маці Алена пакінула занятак спортам. Пакінуў і Іван. Няўрымслівая натура Паньковай шукала нечага ўзвышанага. І знайшла. Дзяўчына падалася ў танцавальны калектыў клуба імя Леніна, якім і тады кіраваў цяперашні народны артыст Аляксандр Рыбальчанка. Алена ўпадабала танцы, і хоць Рыбальчанка быў патрабавальны, ганяў танцораў на рэпетыцыях, як той казаў, да сёмага поту, усё роўна Алене прыемна было адчуваць, што робіць яна нешта прыемнае для людзей. Асабліва гэта адчувалася на канцэртах, калі гледачы захапляліся віхурнай «лявоніхай», ці дасціпнымі жартамі «юрачкі». Неяк адразу Алена патрапіла ў рытм танцаў і неўзабаве нават ужо вылучалася сярод старэйшых танцораў.

Іван Назарэнка таксама не адстаў ад Алены. Следам за ёй і ён пайшоў у танцавальны. Яна стала для яго як бы тым маяком, на які хацелася раўняцца. Ён і працаваць перайшоў з электратэхнічнага ў вагоннае дэпо ў якасці электразваршчыка. Іван кожны раз стараўся так пацэльваць, каб працаваць у адной змене з Аленай.

Алена сэрцам адчувала, што хлопец гэтак прыкіпеў да яе не для забавы, а мае нейкі сур'ёзны намер. Аднаго разу, калі яны познім вечарам ішлі з рэпетыцыі, Іван неяк нясмела, як бы ён рашаўся на нешта недазволенае, сказаў Алене:

— А што, калі нам пажаніцца?

— Што ты, што ты? — аж спалохалася Алена гэтага нечаканага запытання, а потым да яе вярнулася адчуванне гумару і яна сказала: — Як пажэнімся, то, відаць, дзеці будуць.

— Ты не жартуй. Я не на жарты пытаю ў цябе.

— Не ведаю, не ведаю, любы, — сказала яна і прыгарнулася блізенька-блізенька да Івана. Хлопец зразумеў, што ніякага больш адказу і не трэба. Гарачыя пацалункі, як тыя пячаткі, змацоўвалі саюз двух сэрцаў. Аднак Алена сказала:

— Трэба ж у мамы папытаць, што яна яшчэ скажа...

— Хадзем у хату і ўдваіх упадзём на калені, — прапанаваў Іван, набраўшыся рашучасці.

— Не трэба, не трэба адразу ўдваіх, я сама папытаю ў мамы.

Расставаліся ў той вечар яны вельмі ж неахвотна, кожнаму, відаць, карцела: а што скажа маці? Ды і свае маці Іван яшчэ не пытаў, але ён быў упэўнены, што яго маці згодзіцца, бо ў хлопца ўжо і гады такія, што трэба прыбівацца да пары і ладзіць сталае жыццё на ўвесь век.

Неяк выпала так, што Алена з маці засталіся ў кватэры адны. Дзяўчына палічыла, што гэта самы зручны момант папытаць, ні перад кім — ні перад сястрой, ні перад братам не чырванеючы. Неяк спяшаючыся, збіваючыся з слова на слова, заікаючыся, сказала:

— Мам! А мама!

— Чаго ты там? — азвалася з другога пакою маці.

— А што будзе, калі мы з Іванам пажэнімся?

— З якім Іванам? Што гэта ты надумала?

— Мамачка, ён дужа харошы хлопец. Такога трэба пашукаць. Ты, як пабачыш, дык ён і табе спадабаецца,—гаварыла, забыўшыся на тое, што маці яго ўжо бачыла тады, як прывёў яе са стадыёна.

— Ты не глядзі, дачушка, каб з твару ён быў прыгожы. Ты з яго карцін пісаць не будзеш. Галоўнае, каб душа ў яго прыгожая была.

— Душа ў яго добрая, матуля,—ледзь не кінулася абнімаць маці Алена, бачачы, што тая згаджаецца.

Алена з Іванам жылі ў згодзе і лагодзе. Разам працавалі, стараючыся адно перад адным. Абое яны сталі такімі электразваршчыкамі, што іх работу ставілі ў прыклад. І ў танцавальным калектыве на іх рахунак заўсёды запісваўся поспех. Знайшліся дзеткі, і яны стараліся іх выхаваць як належыць. Радасць і шчасце, здавалася, назаўсёды пасябравалі з гэтай маладой сям'ёй.

(Заканчэнне на 4-й стар.).

НА ТЭМЫ ДНЯ

МАЛУЮ ДРАМАТУРГІЮ — НА ВЯЛІКУЮ СЦЭНУ

У Мінску днямі закончыліся гастролі Маскоўскага новага тэатра мініятур.

Такі тэатр мінчане бачаць упершыню, калі не лічыць гастролі эстраднага калектыву пад кіраўніцтвам Аркадзя Райкіна, які таксама прыязджаў да нас. Але Райкін — з'ява своеасаблівая — тэатр аднаго акцёра.

На гэты ж раз гледачы ўбачылі ансамблевы калектыў, а не антураж дзеля аднаго-двух «прэм'ераў».

У праграме Тэатра мініятур ёсць жарты, кароткія інтэрмедыі, пародыі, але асноўнае месца займаюць «кароткаметражныя» п'есы — мініятурныя аднаактоўкі на розныя тэмы нашага жыцця.

Новае ў ім — арыентацыя на драматургію малых форм, чаго даўнымдаўно не было ўжо ў нашым тэатральным жыцці, калі гаварыць аб прафесіянальным мастацтве.

Няхай праграма масквічоў не ва ўсім была бездакорная, але, паглядзеўшы яе, нельга не задумацца над некаторымі пытаннямі развіцця беларускай аднаактовай драматургіі.

Далёка не сакрэт, што гэты жанр у нас сапраўды адстае. Вельмі цяжка назваць хоць бы дзве — тры аднаактовыя п'есы, якія надоўга ўвайшлі ў рэпертуар мастацкай самадзейнасці і адпавядаюць высокім патрабаванням мастацкага твора. Многія аўтары, якія ў свой час актыўна працавалі ў гэтым жанры, зараз занядбалі яго. Драматургаў-«малафармістаў» сёння можна пералічыць па пальцах аднае рукі.

Справа ў тым, што прафесіянальнае сцэнічнае мастацтва адгарадзілася ад «малой» драматургіі сцяной; маўляў, аднаактоўкі пішуцца не для тэатра, а для самадзейнага мастацтва. Тэатры, як правіла, не працуюць над малаактовай драматургіяй, не ўключаюць яе ў рэпертуарныя планы, таму аўтары аднаактовак не маюць магчымасці працаваць з прафесіянальнымі калектывамі і павышаць сваё майстэрства.

Нават народныя тэатры, якія выраслі з аднаактовай драматургіі, зараз таксама пагарджаюць ёй і лічаць не салідной справай ставіць нейкія там аднаактоўкі.

А жыццё між тым вымагае шукаць баявыя, аператыўныя формы ўтаржэння тэатральнага мастацтва ў рэчаіснасць. Сталічныя і абласныя тэатры часта выязджаюць са спектаклямі ў раённыя і калгасныя цэнтры рэспублікі. Без выязных спектакляў сёння немагчыма жыццё ніводнага сцэнічнага калектыву.

Але добра вядома, як усё ж складана выехаць тэатру з вялікім спектаклем у глыбінны раён. Тым больш, калі ў спектаклі занята мноства акцёраў, калі ён мае грувасткае і складанае афармленне, калі да таго яшчэ і сцэны многіх раённых дамоў культуры не адпавядаюць умовам паказу такога спектакля.

Чаму б таму ці іншаму абласному або сталічнаму тэатру не паставіць для выезду добры аднаактовы спектакль або цэлую праграму з двух — трох аднаактовых п'ес з мінімальным афармленнем і ахопам сцэнічнай прасторы? Калі б тэатр папрацаваў, як мае быць, над праграмай, яна з поспехам пайшла б і на асноўнай сцэне. Гледачы з вялікай ахвотай паглядзелі б тую праграму, што і было прадэманстравана на гастролях масквічоў.

Калі б такія спектаклі атрымалі свае грамадзянскія правы на прафесіянальнай сцэне, напэўна ж з'явіліся б драматургі малых форм, напэўна ж было б куды вышэйшым і іх майстэрства. Зараз яны пішуць свае п'есы з разлікам на нейкіх абстрактных самадзейных артыстаў, падладжваюцца пад магчымасці самадзейнай сцэны і свядома зніжаюць якасць п'ес. Беларускае выдавецтва не так ужо мала выпускае зборнікаў аднаактовак для самадзейнасці, але ні ў адным з іх нельга знайсці сапраўдны сцэнічны твор, у якім было б цікавае напружанае дзеянне, вострая сцэнічная мова, захапляючыя сітуацыі. На прафесіянальнай сцэне аднаактовая п'еса набыла б усе гэтыя якасці і стала б эталонам, узорам для аўтараў малых форм. Па іх раўняліся б не толькі аўтары, але і самадзейныя і народныя тэатры. Для іх трэба паказаць гэтыя ўзоры, каб яны зразумелі, што аднаактовая п'еса — ёмісты літаратурны твор, што для яе пастаноўкі патрабуецца не абы якое рэжысёрскае і акцёрскае майстэрства. Гогалеўскіх «Ігракоў» сыграе не кожны прафесіянальны тэатр, а між тым гэта — аднаактовая п'еса.

Вось такі ўзор павінен стварыць і паказаць прафесіянальны тэатр. Тое, што некаторыя акцёры і рэжысёры нашых тэатраў ставяць у самадзейных гуртках аднаактовыя п'есы, — яшчэ мала што рашае. Тэатр у цэлым павінен узняць на больш высокую ступень жанр аднаактовай драматургіі, прад'яўляючы ёй сур'ёзныя прафесіянальныя патрабаванні.

Важна не само па сабе майстэрства і літаратурная якасць аднаактовай п'есы. Важней тое, што гэтая якасць будзе вымагаць больш высокай сцэнічнай культуры мастацкай самадзейнасці, будзе павышаць яе эстэтычныя крытэрыі.

А ці не гэта ж адна з высакародных задач прафесіянальнага мастацтва, і ў прыватнасці тэатра, калі гаворка ідзе пра дапамогу народнай творчасці?

Сёння кампазітары дапамагаюць музычнай і песеннай самадзейнасці, мастакі — выяўленчай, кінематаграфісты — кінааматарам. Чаму ж тэатрам не дапамагчы стварыць для самадзейнасці высокамастацкую аднаактовую драматургію?

І, відаць, не зусім правільна, калі народныя тэатры пераключыліся на пастаноўку многаактовых спектакляў, з якімі не выедзеш ні ў звычайны калгасны, ні тым больш, у брыгадны клуб, або з агітбрыгадай. А народны тэатр мог бы стварыць узоры пастановак аднаактовых п'ес, пастановак, з якіх бралі б прыклад самадзейныя калектывы.

Вялікую надзею ўскладае наша грамадскасць на тэатральную групу пры Белдзяржфілармоніі. Гэтая група, відаць, стане зародкам будучага Беларускага тэатра мініятур, створанага па ўзору маскоўскага сабрата. Поспех масквічоў павінен натхніць нашу філармонію, якой варта паклапаціцца, каб хутчэй і ў нас нарадзіўся такі тэатр. Толькі не трэба паўтараць сумны вопыт стварэння ансамбля аперэты, які нядаўна скончыў сваё бясслаўнае існаванне. Белдзяржэстрада стварыла ў свой час гэты ансамбль, кіруючыся толькі камерцыйнымі меркаваннямі. Калі па такому шляху пойдзе і тэатральная група Белдзяржфілармоніі, можна загадзя сказаць, што не варта агарод гарадзіць.

Будучы Беларускі тэатр мініятур мусіць стаць лабараторыяй, творчым цэнтрам малых форм нашай драматургіі, каб яго спектаклі былі адшліфаваны з такім жа прафесіянальным бляскам, які мы бачылі ў тэатры нашых маскоўскіх гасцей.

Узнагароджанне А. А. Зарыцкага

У сувязі з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння і за заслугі ў развіцці беларускай літаратуры Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР указам ад 21 сакавіка г. г. узнагародзіў Аляксея Аляксандравіча ЗАРЫЦКАГА Ганаровай граматай.

ІМ ПРЫСВОЕНЫ ГАНАРОВЫЯ ЗВАННІ

Народны мастак БССР Аскар Пятровіч МАРЫКС большую частку свайго жыцця (40 год) працуе на Беларусі як тэатральны мастак. Ён афармляў каля 300 спектакляў савецкай, рускай і зарубежнай класікі ў розных тэатрах; чатырнаццаць год быў галоўным мастаком Першага Белдзяржрамтэатра (Тэатр імя Янкі Купалы).

Творчасць Марыкса адрозніваецца глыбокай эрудыцыяй у галіне класічнага мастацтва, тонкім эстэтычным густам, добрым разуменнем сучаснай тэмы. Мастак вядзе вялікую грамадска-педагагічную і навукова-даследчую работу ў Тэатральна-мастацкім інстытуце.

Сцэнічныя вобразы, якія стварыў заслужаны артыст БССР Георгій Сцяпанавіч ЛАЎРОЎ, характэрныя сакавітасцю фарбаў і жыццёвай праўдай. Сярод іх вылучаюцца — прафесар Паляжаеў («Неспакойная старасць»), паручык Яравы («Любоў Яравая»), Шальменка («Шальменка-дзяншчык»), Нядбайла («Чалавек вярнуўся»). Гледачы любяць артыста Вабруйскага перасоўнага тэатра Г. Лаўрова за глыбокія пачуцці,

Прыгледзімся: *што нас акружае?*

Чалавеку не шкодзіць час ад часу азірнуцца і паглядзець, якія рэчы акружаюць яго на вуліцы, дома, на рабоце. Рэчы ўплываюць на нашу работу, настрой, на ўсё наша жыццё.

Зойдзеш часам у кватэру і бачыш, што ў ёй цесна, хоць жылой плошчы дастаткова. Нават у прасторнай кватэры бывае вельмі цесна; чаго толькі там не настаўлена — шафы, шафачкі, падставачкі, фікусы, дзесятак крэслаў, табурэтаў і абавязкова ў цэнтры пакоя вялізны круглы стол. Хадзіць па такім пакоі няма як. Трэба працісканца. Тут ужо не чалавек гаспадар над рэчамі, а рэчы паланілі чалавека: паспрабуй паглядзець за ўсім! Многія рэчы непрыгожыя, груваcткія.

Па кватэры бегае дзіця. З маленства яно пачынае думаць, што бабульчына шафа — самая прыгожая і дасканалая на свеце, што такі парадак, які існуе ў кватэры, — самы разумны. Дзіця падрасце і падобную бытавую неахайнасць перанясе і ў сваё жыццё.

Раней нам проста не было калі займацца гэтым; мы будавалі гарады і вёскі, фабрыкі і заводы. Цяпер у нас — добрыя гарады, цудоўныя прамысловыя прадпрыемствы, кватэры, тэатры, школы, Палацы культуры. Час прыгледзецца і да таго, што нас акружае.

Газеты, радыё, часопісы, тэлебачанне вельмі рэдка гавораць пра дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. І не дзіва, што кіраўнікі прадпрыемстваў і ўстаноў, якія павінны клапаціцца пра развіццё дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, глядзяць на яго абыякава. Таму гэтае мастацтва жывіцца пакуль толькі энергіяй асобных энтузіястаў, ім яшчэ не займаюцца як мае быць дзяржаўныя ўстановы. Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР толькі збірае матэрыялы па народнаму беларускаму мастацтву. А вось, напрыклад, у Чэхаславакіі, Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы існуюць інстытуты, якія не толькі збіраюць усё самабытнае, народнае, але і творча апрацоўваюць яго, прапануюць дзяржаўным прадпрыемствам выпускаць прадметы зручныя, прыгожыя, танныя.

У нас ёсць усе ўмовы, каб развіваць дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Неабходна збіраць і творча асвойваць багатую народную спадчыну. І тут не трэба аглядацца на тых людзей, якія кажуць:

— Вы цягнеце да андарака, вы хочаце, каб у мяне дома былі сялянскія посцілкі і глечыкі. А я не хачу. Гэта мне не да спадобы.

Ёсць своеасаблівыя беларускія вёскі. Адны з іх вядомыя сваімі керамічнымі вырабамі — глечыкамі, свістулькамі, цацкамі, другія — цудоўнымі вышыўкамі, трэція — разьбой па дрэву, чацвёртыя — посцілкамі, пятыя—інкрустацыяй. Трапіш часам у такую вёску і вачэй не можаш адвесці ад аканіц, падстрэшнікаў. З вялікім густам, тонка, з добрым веданнем фактуры дрэва зроблена разьба. А ў хаце здзіўляюць посцілкі дасціпным спалучэннем колераў, простым і прыгожым малюнкам. Вось у каго трэба вучыцца мастакам, вось крыніца, з якой могуць чэрпаць прыгажосць нашы фабрыкі і арцелі. Зразумела, тут трэба выступаць супраць стылізацыі, павярхоўнага пераймання. Неабходна добра адчуць дух, асноўныя заканамернасці народнай творчасці і ўзняць яе да вяршынь вялікага мастацтва. Так робяць, напрыклад, у Прыбалтыйскіх рэспубліках. Рускія народныя промыслы — хахламскія вырабы з дрэва і роспісы, вяцкая цацка, палехская мініятура і іншыя, дзякуючы настойлівым клопатам, увазе такіх буйных дзеячоў культуры, як М. Горкі, выраслі да сусветна вядомых. Вяцкую керамічную дэкаратыўную цацку можна сустрэць у многіх краінах, яна ўдала падыходзіць да любога пакоя. Лонданскі музей пасля Сусветнай выстаўкі ў Брусэлі заказаў майстрам Хахламы вялікую партыю вырабаў з дрэва. Пра палехскую мініятуру пішуць тамы. Вядомы ўсяму свету і ўкраінскія керамічныя дэкаратыўныя вырабы. Наша керамічная народная скульптура, можа, не ўступае ўкраінскай. Але мы, на жаль, не клапоцімся, каб развіваць яе, каб сабраць лепшае, наладзіць вытворчасць. Нашы посцілкі не горшыя за прыбалтыйскія, але мы і тут абыякава ставімся да свайго багацця.

Заходзіш у ГУМ, пытаешся:

— Адкуль гэтыя цудоўныя ільняныя посцілкі?

— З Іванава.

— А гэтыя?

— З Кастрамы, Смаленска, Рыгі.

— А беларускія ёсць?

— Няма.

Так, мы не карыстаемся сваёй вялікай народнай спадчынай. Справа часам даходзіць амаль да анекдотаў. Мастакі Івянецкай керамічнай арцелі паехалі шукаць узоры не на Піншчыну, а ў Сярэднюю Азію. Адтуль яны прывезлі вазы на тонкай ножцы і з шырокім тулавам, аздобілі іх беларускім арнаментам і палічылі, што знайшлі самабытную нацыянальную форму. А між тым, — беларускі арнамент зусім не стасуецца да ўзбекскіх ваз. Не дзіва, што вазы ні хто не купляе.

Рэдка скарыстоўвае беларускія народныя матывы і Віцебскі дывановы камбінат.

А хто ведае адметную мінскую альбо бабруйскую мэблю? Няма такой мэблі. Нашы фабрыкі выпускаюць «прадукцыю наогул». Кожны мінчанін, масквіч, ленінградзец ведае, напрыклад, рыжскую, чэхаславацкую і іншую мэблю. Наша ж мэбля вельмі нязручная, груваcтая і непрыгожая. Да гэтага часу ў беларускіх магазінах прадаюцца велізарнейшыя шафы, старакупецкія крэслы, агромністыя круглыя сталы.

Пытаеш у мастакоў:

— Чаму ў нас так з мэбляй?

Яны сцвярджаюць, што ўзоры новай, самабытнай, прыгожай і партатыўнай мэблі ёсць, некаторыя з іх нават адзначаны ўсесаюзнымі прэміямі. Але кіраўнікі прадпрыемстваў не жадаюць пераходзіць на выпуск новай мэблі. Некаторыя з іх спасылаюцца на тое, што новая мэбля быццам нязвыклая, яе ніхто не будзе купляць. У такім разе паім іх наведаць магазін, калі прыходзіць мэбля з Рыгі, Чэхаславакіі або ГДР. Яна нават не трапляе ў памяшканне магазіна, бо яе адразу ж раскупляюць. Гэтая мэбля танная, зручная, прыгожая. Дык трэба ж і нам, нарэшце, паклапаціцца пра сваю мэблю.

Настолькі ж абыякава ставяцца кіраўнікі прадпрыемстваў да развіцця керамікі і ткацтва.

У Мінску па вуліцы Някрасава знаходзіцца керамічная майстэрня Беларускага мастацкага фонду. Яна арганізавана два гады назад, а ўжо сёння адпраўляе прадукцыю не толькі ў беларускія гарады, але і ў магазіны Масквы, Ленінграда. Узнікла, трымаецца і расце майстэрня амаль што на адным энтузіязме яе работнікаў. Тут няма абсталявання. Не хапае работнікам часу для эксперыментальнай работы — дырэкцыя мастацкага фонду даводзіць такія планы, якія ледзь-ледзь можна паспець выканаць. Нават у нядзелю ў майстэрні можна знайсці каго-небудзь з майстроў, мадэльераў. У невялічкім пакойчыку цэлая навукова-даследчая лабараторыя. Зіхацяць рознымі колерамі паліваныя чарапкі, тут жа стаяць вазы і іншыя дэкаратыўныя вырабы, якія даўно выпускаюцца або вынайдзены літаральна ўчора. Мастакі нястомна шукаюць новыя формы, выразныя, лаканічныя, імкнуцца знайсці такія рашэнні, якія адпавядаюць духу беларускай керамікі.

Вяцкія керамічныя вырабы маюць свае адметныя якасці, украінскія і літоўскія—свае. Нейкія свае асаблівасці выяўляюцца і ў нашых керамічных вырабах. І калі дырэкцыя мастацкага фонду лепш паклапоціцца пра развіццё майстэрні, праз некаторы час мы атрымаем сапраўды высокамастацкую беларускую кераміку, якая стане побач з вяцкай, украінскай, літоўскай.

За сцяной керамічнай майстэрні працуе ткацкі цэх. Работы тут толькі-толькі пачынаюцца. Выпушчана ўсяго некалькі ўзораў ручнікоў і абрусаў.

Што можа радаваць, дык гэта шкло. У нас, на Беларусі, мастацкае шкло выпускаюць Барысаўскі шклозавод імя Дзяржынскага і шклозавод «Нёман». Нёманскае шкло атрымала прэмію на Сусветнай выстаўцы ў Брусэлі. Зараз мастакі падрыхтавалі да масавай вытворчасці новыя ўзоры вырабаў, адзначаныя ўсесаюзнай прэміяй. Многа цудоўных шкляных вырабаў было ўпершыню прадстаўлена на мастацкую рэспубліканскую выстаўку ў Мінску.

Каб развіць адметнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, трэба не толькі пераадолець пасіўнасць і абыякавасць да ўпрыгожання дома, вуліцы, тэатраў, неабходна яшчэ паклапаціцца аб кадрах. У нас вельмі мала спецыялістаў прыкладнога мастацтва. Многія працуюць у неспрыяльных умовах, а некаторыя з-за гэтага зусім адмовіліся ад работы ў сваёй галіне. І таму перш-наперш трэба, каб тыя спецыялісты, якія ёсць, пачалі працаваць. Добра было б, каб Тэатральна-мастацкі інстытут меў аддзяленне прыкладнога мастацтва.

Мы павінны ствараць харастро ў нашых кватэрах, на вуліцах, на рабоце.

В. ГОВАР.

Выстаўкі работ народных умельцаў

Міністэрства культуры БССР намецілі правесці ў верасні і кастрычніку рэспубліканскую і абласныя выстаўкі работ майстроў народнай творчасці.

Мэта выставак — спрыяць далейшаму развіццю самадзейнага выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, паказаць у творах народных майстроў поспехі ў выкананні сямігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі, падрыхтоўку да дастойнай сустрэчы XXII з'езду КПСС.

На выстаўках будуць шырока экспанаваны новыя работы народных умельцаў на тэмы сучаснасці.

Сустрэча з мастакамі

Моладзь Гродна сустрэлася з мастакамі сваёй вобласці.

Маладыя рабочыя, студэнты пазнаёміліся з выстаўкай, на якой былі прадстаўлены работы мастакоў Пушкова, Парахні, Коха, Савіцкага, Баразны і інш.

І. Пушкоў расказаў, над чым працуюць мастакі Гродзеншчыны.

Затым В. Савіцкі і Л. Баразна гаварылі пра тое, як ствараюцца карціны, падзяліліся творчымі задумамі.

На сустрэчы гаварылася пра тое, што гродзенскія мастакі ўзялі шэфства над калгасам «Гвардыя» Берастовіцкага раёна. Яны арганізавалі там выстаўку карцін.

Калектыў мастацкай самадзейнасці Дома культуры існуе каля дзесяці год. У хоры і гуртках (музычным, акрабатычным, мастацкага чытання) больш 60 удзельнікаў. Гэта людзі розных прафесій: рабочы Зіновій Бянько, загадчыца Дома санітарнай асветы Валянціна Баравікова, урач Міхаіл Вайман, служачая Мая Шыманоўская і інш.

Хор вылучаецца зладжанасцю гучання, добра выконвае песні «Савецкая наша дзяржава» Кабалеўскага, «Радзіма» мастацкага кіраўніка і дырыжора хору В. Аламахі.

Паважаюць гледачы і танцавальны калектыў (кіраўнік А. Місякоўская), які ўдала выконвае «Дзявочы карагод», малдаўскі «Жок», румынскі «Трэнско-хоро», «Уральскую шасцёрку».

І. ЛЕШАНЮК.

На здымках: злева — танцавальны калектыў Дома культуры выконвае танец «Трэнско-хоро», уверсе — выступае чытальнік Пётр Паверга

Фота А. Асадчага.

АПОШНЯЯ ІНСТАНЦЫЯ

Ад Мінска да Радашковіч паўтары гадзіны язды на аўтобусе.

І вось мы ў бальніцы. Знаёмімся з галоўным урачом Анатолем Рыгоравічам Ціханковым.

Гэта сярэдняга росту чалавек. Яму трыццаць тры гады. Размаўляе паважна і ціха, быццам нехаця. Аб чым бы ні ішла гутарка, — ні ў вачах, ні на твары яго не прамільгне нават цені смутку або ўсмешкі, роздуму або ўзрушанасці. Здаецца, што ён ніколі ў жыцці нічому не здзіўляўся, нішто яго не хвалявала і не ўсхвалюе.

Напэўна, не зусім праўда, калі гавораць людзі: «Глянь чалавеку ў вочы і ўбачыш яго душу».

У вачах А. Ціханкова нічога не відаць, як у марской бездані. Здзіўляючы спакой ва ўсім яго абліччы, рухах. Нават аб непаладках у падначаленым яму калектыве ён не расказвае, а канстатуе. Канстатуе з «фактамі» ў руках.

Нас зацікавіла адразу тое, што ўсе гэтыя «факты» з пратакольнай дакладнасцю апісаны ў дасланым у рэдакцыю пісьме. Нічога новага Анатоль Рыгоравіч не дадаў: тыя ж вывады, тыя ж абвінавачванні маладых урачоў. Але аўтар пісьма не ён.

Толькі гэтае пытанне цяпер адыходзіла на задні план. Яго засланілі сабой іншыя, больш важныя пытанні: што здарылася ў калектыве? Чаму з прыходам маладых урачоў тут усчалася нейкая валтузня, якая хутка перарасла ў збор плётак і ліхаманкай затрэсла калектыў?

Загадчыца інфекцыйнага аддзялення М. Шмыр, як кажуць, жанчына з барометрам у руках. Па хітраватай усмешцы і загадкавай задуменнасці адчуваецца, што сумленне падштурхоўвае яе расказаць аб усім, але яна не можа яшчэ вызначыць, на чый бок стаць: «А што, калі А. Ціханкоў і надалей застанецца галоўным урачом? Няхай лепш даведаюцца аб усім ад іншых...»

У жніўні мінулага года ў Радашковіцкую бальніцу пасля заканчэння Мінская медыцынская інстытута прыехалі працаваць маладыя ўрачы Я. Платкоў і Л. Куніца.

Сустрэлі іх тут цёпла, ветліва. Я. Платкоў і сёння сцвярджае, што «тут не работа, а рай для маладога спецыяліста. Ёсць дзе прыкласці свае веды, аддацца любімай справе, але...»

Але непрыемнасці пачаліся з першых жа дзён. Магчыма, і не варта было расказваць аб гэтым дробязным выпадку, калі б не з яго пачыналася «працоўная біяграфія» маладога ўрача Л. Куніцы, калі б не з гэтай дзіцячай выхадкі А. Ціханкоў пачаў лічыць Л. Куніцу «ворагам» свайго аўтарытэту.

Адбылося гэта ў той памятны дзень, калі загадчык тэрапеўтычнага аддзялення Л. Куніца вырашыў навесці «парадак» у шафе для адзення. Ён распаразідзіўся не вешаць больш палітo малодшага медыцынскага персаналу разам з вопраткай урачоў.

Анатоль Рыгоравіч адмяніў гэтае распараджэнне. Тады Л. Куніца вырашыў перагарадзіць шафу лістом фанеры.

Вось тут бы галоўнаму ўрачу і трэба было пакліваць да сябе маладога ўрача ды як след пасароміць яго, растлумачыць дзівацкі сэнс такога ўчынку. Але ён зразумеў гэта як падрыў свайго аўтарытэту і адразу ж пачаў «прымаць меры» спрактыкаваным спосабам. Анатоль Рыгоравіч запатрабаваў ад медыцынскіх сясцёр і санітарак «дакладных запісак» і «скаргаў» на Л. Куніцу і давёў «справу» да мясцкома прафсаюза.

Не ведаў урач Куніца, з кім яму давялося мець справу. З гэтага часу кожны яго крок быў пад неаслабнай увагай Анатоля Рыгоравіча, з кожным днём таўсцела заведзеная на яго «асабістая справа». Амаль ні адной «пяцімінуткі» не праходзіла, каб не кідаліся дакоры загадчыку тэрапеўтычнага аддзялення ўрачу Л. Куніцу.

Нарэшце, апошні адмовіўся прысутнічаць на ўрачэбных «пяцімінутках». Маладыя ўрачы Я. Платкоў, А. Цыгалка, Ф. Школьнікава і Б. Абармовіч выступілі ў падтрымку Л. Куніцы і спрабавалі даказаць, што такія адносіны да іх калегі з боку галоўнага ўрача выклікаюць трывогу.

І гэтага аказалася дастаткова, каб усе яны трапілі ў «чорны спіс» А. Ціханкова. На кожнага была заведзена «справа», каб у эручны момант «заткнуць рот фактамі». Адпаведна павысіліся патрабаванні і ўзмацніўся «кантроль» за кожным з іх. На службу Анатолю Рыгоравічу быў пастаўлены ўвесь «надзейны» персанал, страчыліся «скаргі» і дакладныя запіскі. Пляткарская канцылярыя запрацавала на ўсю моц.

Няма патрэбы многа гаварыць, каб пераканаць, што адшукаць у чалавека дадатныя рысы ў характары, станоўчае ў працы, падтрымаць і дапамагчы развіцца гэтаму дадатнаму — значна цяжэй, чым знайсці плямінку і (пры жаданні) раздзьмуць яе ў непамерную загану.

Дарэчы, тут ніхто і не спрабаваў шукаць станоўчага ў працы маладых спецыялістаў. А такія вопытныя ўрачы, як П. Паўкалас, К. Мякіннікаў і Е. Васюк, фактычна засталіся пабочнымі назіральнікамі. Ніхто з іх не жадаў стаць на бок праўды і сказаць проста ў вочы галоўнаму ўрачу А. Ціханкову: «Кіньце, Анатоль Рыгоравіч, думаць аб сваім аўтарытэце, якога ў вас даўно ўжо не існуе. Вы згубілі яго яшчэ тады, калі пачыналі падобную валтузню, збіралі плёткі, праўду і няпраўду на хірурга бальніцы Іванчанку. Цяпер вы зноў сталі на той жа шлях».

Хто ведае? Можа быць іменна за такую бесспрынцыпную пазіцыю і хваліў аўтар пісьма ў рэдакцыю ўрачоў К. Мякіннікава, П. Паўкаласа, Е. Васюк і М. Шмыр, называючы іх «проста-такі цудоўнымі людзьмі».

Анатоль Рыгоравіч і сёння не можа пагадзіцца з думкай, што судовы працэс, які ён распачаў з хірургам Іванчанкам і аб якім паведамляла наша газета («Літаратура і мастацтва» № 100 ад 19 снежня 1959 г.) ў артыкуле «Працэс аб стаптаных тапачках» быў працэсам над яго аўтарытэтам. Але, на жаль, гэта так. Суд адбыўся тады не ў карысць А. Ціханкова.

У людзей існуе выдатнае правіла: зганьбіў сябе чым-небудзь—апраўдай сваё імя добрымі справамі, дакажы, што ты варты павагі.

Такая магчымасць была і ў Анатоля Рыгоравіча. Але ён не захацеў здабываць сабе аўтарытэт гэтым шляхам. У яго руках быў адміністратарскі палаш, якім ён і пачаў размахваць налева і направа. Такім палашом з'явіліся загады па бальніцы. Градам яны сыпаліся на галовы маладых спецыялістаў. Сыпаліся часта і густа. З алімпійскім спакоем пісаў іх А. Ціханкоў—спакойна ўспрыймалі іх і маладыя ўрачы: прывыклі ўжо.

Больш, чым іншым, даставалася ўрачу Л. Куніцу, бо ён спрабаваў часам даказаць неабгрунтаванасць спагнанняў. Анатоль Рыгоравіч цвёрда вырашыў разлічыцца з гэтым непадатлівым падначаленым і спакойна збіраў «факты» і выносіў спагнанні.

А між тым, справы ў бальніцы з кожным днём занепадалі. Распачатая ў калектыве валтузня адмоўна адбівалася на стане лячэбнага працэсу. У кнігі скаргаў амаль у кожным аддзяленні пасыпаліся папрокі і нараканні. Анатоль Рыгоравіч і тут знайшоў выйсце: ліквідаваў кнігі скаргаў па аддзяленнях і пакінуў толькі адну на ўсю бальніцу. Паспрабуй, знайдзі яе, хворы чалавек!

Дайшло да таго, што працоўная дысцыпліна перастала быць агульнай нормай паводзін на працы. Так, урачы Я. Платкоў, Ф. Школьнікава і Л. Куніца да гэтага часу маюць мінскую прапіску і на кожны выхадны дзень стараюцца патрапіць раней «дадому», а ў панядзелак іншы раз спазняюцца на работу на 20—30 мінут і таму не паспяваюць на ўрачэбныя «пяцімінуткі».

І ўжо зусім незразумелае становішча, калі савецкі ўрач адмаўляецца тэрмінова дапамагчы цяжка хвораму. Так, хірург А. Цыгалка доўгі час не згаджаўся аказаць тэрміновую хірургічную дапамогу хворай т. Кароткай у радзільным аддзяленні бальніцы. І толькі калі папрасілі яго ў трэці раз, ён пайшоў. Варта было прамарудзіць яшчэ з дзесяць мінут — і было б позна.

Фактаў страшэннай абыякавасці да чалавека з боку некаторых урачоў Радашковіцкай бальніцы можна прывесці нямала. Так, урач Я. Платкоў запісваў «актыўныя наведванні» хворых на кватэрах, да якіх іншы раз нават і не заходзіў. Урач-педыятар Б. Абрамовіч адмовілася пайсці ў дзіцячы сад і высветліць падазрэнне на інфекцыйнае захворванне сярод дзяцей. Ёй, маўляў, за гэта грошай не плацяць.

Каб закончыць гэты непрыемны пералік фактаў занядбанасці ў рабоце бальніцы, варта спыніцца яшчэ на адным.

У хірургічным аддзяленні, якім загадвае ўрач А. Цыгалка, па паўтара—два месяцы не вядуцца запісы стану здароўя хворых у дзённіку. Якую ж пасля гэтага можна весці размову аб нармальным лячэбным працэсе? Дзе вы знойдзеце яшчэ падобную абыякавасць і злачынныя адносіны да здароўя чалавека?

Пасля гэтага справядлівымі будуць пытанні: а ці ёсць там галоўны ўрач бальніцы? Ці ёсць там намеснік галоўнага ўрача па лячэбнай частцы? Робяць яны абходы хворых? Цікавяцца станам спраў, пастаноўкай лячэбнага працэсу?

Вядома, ёсць. Галоўны ўрач А. Ціханкоў і яго намеснік па лячэбнай частцы К. Мякіннікаў. Дарэчы, і сам Анатоль Рыгоравіч як хірург працуе ў гэтым жа аддзяленні. Смешна было б думаць, што ён не ведае такога становішча. Ён і не адмаўляе, што ведаў, і ведаў даўно, але, бачыце, «не хацеў пакрыўдзіць заўвагай калегу», разам з якім робіць аперацыі, асістыруе яму.

Нешта падобнае сцвярджае і Мякіннікаў. А ў сапраўднасці — збіралі «факты», каб у эручны момант нанесці праціўніку ўдар. У выніку развалілі калектыў, развалілі работу ў бальніцы. І дарэмна цяпер у адзін голас намагаецеся зваліць усё на маладых урачоў. Большасць «фактаў», сабраных вамі, гавораць не толькі аб тых ці іншых памылках маладых спецыялістаў, а яскрава сведчаць і аб вашых непрыстойных паводзінах у калектыве.

Замест выхаваўчай работы, жадання крочыць у нагу з жыццём, у нагу з усім савецкім народам, вы сваімі адносінамі ўнеслі разлад у калектыў і намагаецеся супрацьпаставіць вопытных урачоў маладым, каб за гэтай валтузнёй і спрэчкамі схаваць сваю няздольнасць і бездапаможнасць на пасадах, якія займаеце.

Дарэмна было б сцвярджаць, што маладыя ўрачы не маюць тых ці іншых памылак. Але ж вы, Анатоль Рыгоравіч, хацелі таго ці не, самі часам штурхалі іх на гэта.

З першых жа дзён замест шчырай дапамогі вы пачалі іх «прыручаць» да безумоўнага падпарадкавання свайму аўтарытэту. А тых, хто не згаджаўся, стараліся ачарніць, запалохаць, скампраметаваць і пазбавіцца іх.

Іменна такім і аказаўся ўрач Л. Куніца. Ці ж не пагардзі з вашага боку была абраза «шасцімесячным неданоскі» ў адрас маладых урачоў?

Выкарыстаўшы ўвесь свой адміністратарскі арсенал спагнанняў на ўрача Л. Куніцу, А. Ціханкоў дамогся, што апошняму ў абласным аддзеле аховы здароўя аб'явілі суровую вымову. Але ж гэтага яшчэ аказалася недастаткова. І Анатоль Рыгоравіч узбудзіў судовую справу. Абвінавачваўся Л. Куніца, які «незаконна» падпісаў у аптэку «заяўку-патрабаванне» на медыкаменты і прэпараты для «чужога» яму рэнтгенкабінета. Суд адхіліў іск як не абгрунтаваны.

Другі судовы працэс—і другі раз не ў карысць А. Ціханкова.

На такі канец справы Анатоль Рыгоравіч не спадзяваўся. І тут на памяць яму прыйшоў злашчасны артыкул «Працэс аб стаптаных тапачках».

— Ёсць яшчэ адна інстанцыя, апошняя,—мільганула думка. — Трэба напісаць у газету...

Разлік у А. Ціханкова быў просты, а прыцэл—далёкі. Варта было газеце надрукаваць атрыманае пісьмо, як у руках да Анатоля Рыгоравіча траліў бы аўтарытэтны факт, які даў бы магчымасць лёгка расправіцца з непажаданымі яму ўрачамі.

— Дык дзе ж гэта можна адшукаць аўтара пісьма? — пытаемся ў А. Ціханкова.

— Пісаў яго Сымук, мой намеснік па гаспадарчай частцы,— прызнаецца Анатоль Рыгоравіч.

— Толькі вы не думайце, што пісаў я пад дыктоўку галоўнага ўрача, — апраўдваецца Сымук.—Я напісаў яго сам, а затым прачытаў А. Ціханкову. Ён адобрыў і сказаў: «А цяпер пасылай у рэдакцыю».

— А чаму вы свайго прозвішча не падпісалі?

Сымук разгублена паціскае плячыма і вінавата лыпае вачыма...

Цяжка сказаць: ці можна ніжэй скаціцца і знайсці больш непрыстойныя метады шальмавання людзей, чым тыя, якімі карыстаецца А. Ціханкоў?..

З гутаркі з загадчыкам Маладзечанскага гарадскога аддзела аховы здароўя высветлілася, што прымаюцца адпаведныя меры «па аздараўленню» калектыву Радашковіцкай бальніцы. Тав. Шут сказаў:

— Ціханкова накіруем на вучобу, а Куніцу перавядзём у другое месца

Як гаворыць народная прыказка «Памры, Макар, а лепей не прыдумаеш!» Заваліў работу—едзь вучыцца.

І. МЯЦЬКО.

Рэдакцыя газеты «Літаратура і мастацтва» атрымала пісьмо. У ім паведамлялася, што маладыя ўрачы Радашковіцкай бальніцы Я. Платкоў, Л. Куніца і Ф. Школьнікава «аказаліся чэрствымі самалюбцамі і эгаістамі, стараюцца вылучыць сябе, адмежавацца ад усіх, не жадаюць ні з кім лічыцца, бударажаць калектыў і перашкаджаюць працаваць».

Карэспандэнт газеты выехаў на месца, у выніку чаго і з'явіўся публікуемы артыкул.

НАШ СУЧАСНІК У ЖЫЦЦІ І У МАСТАЦТВЕ

ЛІРЫЧНЫ ПАФАС І ПАЭТЫЧНАЯ СКАРАГАВОРКА

Паўнапраўны герой сённяшняй літаратуры — чалавек працы, чалавек шырокіх інтэлектуальных інтарэсаў і высокай душэўнай патрабавальнасці, чалавек, які мысліць маштабна, падзяржаўнаму, з ясным усведамленнем таго, што «вецер веку дзьме ў нашы ветразі». Наш сучаснік — ён выяўляе і лепшыя рысы грамадзяніна будучыні. Нялёгка перадаць у мастацкім творы смеласць яго дзяржаўнаму і размах яго творчасці. Спробай раскрыць прыгажосць гэтай натуры і з'яўляецца новая паэма Антона Бялевіча «Слова пра вернага друга» («Полымя» № 2, 1961).

Паэма расказвае пра нявыдуманую асобу — Міколу Аляксейчыка, земляка і друга паэта, кандыдата тэхнічных навук, які па ўласнаму жаданню паехаў працаваць у родны калгас на Уздзеншчыне. Ужо гэта таіла ў сабе сур'ёзныя цяжкасці для паэта. З аднаго боку, трэба было даць канкрэтную біяграфію равесніка, з другога—намаляваць абагульнены партрэт сучасніка. Антон Бялевіч адзначае, што «на Уздзеншчыне багата такіх людзей, як верны друг», падкрэсліваючы звычайнасць героя.

Што галоўнае, вызначальнае ў характары Міколы? Настойлівасць. Ён, сцвярджае паэт, быў «вайной суровай гартаваны», пасля дэмабілізацыі «шасейнікам служыў і дзень пры дні навукай жыў» і, урэшце, дамогся свайго — атрымаў вучоную ступень. Перад намі не сентыментальны юнак, гатовы кінуцца на злом галавы па ўёпаміны дзяцінства, туды, дзе калісьці «лубелі ў росах калашыны». Гэта — чалавек трывалага гарту, акрэсленай мэты. Яму блізкія клопаты землякоў, чыё «вецер поле баранае»; ён адчувае, што «няма разгону для душы», пакуль у землякоў не ладзяцца справы. І Аляксейчык едзе ў бацькоўскія мясціны, каб сваімі ведамі дапамагчы людзям. Гэты факт пакладзены ў аснову твора.

Антон Бялевіч — паэт самабытны. Яго паэмы шчодра перасыпаны апісаннямі прыроды — паўнагучнай, маляўнічай, рухомай, неаддзялімай ад сялянскага побыту. Праўда, часам гэта робіцца на шкоду абмалёўцы дзеючых асоб, без пачуцця суразмернасці. Так здарылася і цяпер, здарылася таму, што многія пейзажныя адступленні **не падпарадкаваны** асноўнай задуме. Непамерна вялікая ўвага аддадзена ўспамінам, як «у Лаўскі лес ішлі ў арэхі, шукалі там лісіных нор». Неабавязковасць гэтых мясцін для паэмы відавочная. Перагортваеш першыя старонкі з надзеяй, што яны напісаны для разбегу, што гэта — трамплін для паэта і героя, адкуль яны возьмуць старт.

Аляксейчык прыехаў у калгас:

Праа вёску—пылі, Урозлет—куры,
Ажно булькова бензабак...
На ўзгорку домік сацкультуры.
— Прывет, хатлянцы!..

Чакаеш, што вось-вось герой пакажа сябе ў дзеянні, выявіць свой характар. Але спадзяванні чытача не апраўдваюцца. Аўтар збіваецца на другараднае. Гэта відаць хаця б са сцэны калгаснага сходу, на якім выбіраюць Аляксейчыка старшынёй. Замест гаворкі аб справах калгасных, аб лёсе гаспадаркі Бялевіч скіроўвае ўвагу і героя і чытача на патрыярхальнага дзядка, які «адчувае» кандыдата ў калгасныя важакі:

Ты, кажуць, быў у Мінску шышка,
Не на кіёчку нейкі жук.
Гаворыць, ты узлез (?) на вышку:
Сам — Акадэмія навук?

Ідзеш на працу, а дарожка
Табе падмецена мятлой... і г. д.

А сход жа, на якім прысутнічае Аляксейчык, не зусім звычайны: людзі сабраліся выбраць дастойнага старшыню — бо і свае, і прыезныя — не апраўдалі давер'я. Каго мы бачым і чуем? Мітуслівага і несамавітага дзеда, які абяцае «мядком калгасу памагчы». Чаму ж набралі ў рот вады «... плытагоны, рыбакі, і цесляры, і печнікі», дзяўчаты і хлопцы, гэты «дружны маладняк», як называе іх паэт? Няўжо яны ўсур'ёз лічаць старога дзівака сваім трыбунам, усур'ёз мяркуюць, што паміж адставаннем калгаса і тым, што іх зямляк пайшоў у навуку, ёсць прамая сувязь? Прыехаў бы Мікола ці не, перад імі ўсё роўна б стаяла праблема, як узняць калгасную гаспадарку.

Міколу выбіраюць старшынёй. З чаго ён пачынае работу?

Пад вокны ён:—Агу. Параска!
Канчай там васланкай грымець.
На поле час...
— На полі гразка,
У лес не сыйдзе—не мядзведзь.

У хату ён:—Глядзі, Даніла,
Высока сонца. Вунь яно.
— Хе-хе. Дык што? Не маю сілы
Схаваць за пазуху свяціла,
Няхай глядзіць сабе ў акно.

У дворык ён: — Кандрат!
— Я, братка.
— Зямля гарыць. Зямля заве.
— Няўжо?..

Што гэтым хоча падкрэсліць аўтар: увішнасць свайго героя ці абыякавасць хатлянцаў да калгасных спраў? Зноў жа мы тут не бачым ні разваг героя, ні раскрыцця яго характару ў дзеянні. Як пераконвае старшыня хатлянцаў, як прымушае іх паверыць, што і яму блізкая зямля, што ён не забыўся на яе?

На касьбе Мікола бярэцца за касу:

Пінжак—на луг, на луг—рубашка:
Камашы вымаклыя—з ног...
Закончыць круг—звініць
мяташкай.

Касцы:—Ты бачыў?
— Бачу.
— Бог!..

Сцэна касавіцы павісае ў паветры таму, што яна першая і апошняя, у якой мы пачынаем бачыць героя непасрэдна ў дзеянні; далей ідуць толькі ўспаміны і пражэкты.

Тут магістральны пойдзе
проста:
З канаў, канавак у сябе
Усмокча воды, кіне ў Шачу,
А Шача — ў Пціч...

І незразумела, чаму калгаснікі ад старшыні «чакаюць слова ды парады... прыйшоў — і гэтаму ўжо рады». І ўжо бяда іх — паўбяды».

Заклапочанасць старшыні калгаснымі справамі аўтар спрабуе паказаць у эпізодзе, калі Аляксейчык з'явіўся на поле дзе кабета
...галасіла,

Нібы над белаю труной:

. . . . . .

Памяла, зблытала, скрышыла
Цябе, лянок харошы мой.

Прыйшоў старшыня, сказаў слова, і, як па чароўнаму загаду, лён «пакрышачку, патрошкі, ішоў у сілу, стаў на ножкі».

Як ні дзіўна, але найбольшай узнёсласці Антон Бялевіч дасягае ў запісанні, як «друг ляжаў на цёплым сене і слухаў ластавак даўно». Вока паэта робіцца тут казіральным.

Акенца круглае ў закоце,
Вароты ластаўкам у сад:
Яны туды, яны назад,
І, шустрыя, ў сваім палёце:
— Ціў-ціў. Як жыў?..
А ён і рад
І шчабятанню, і спакою,
І цвыркуну на сене тым,
І добра думаць пад страхою,
І добра марыць аб усім.

Цудоўныя, глыбока паэтычныя радкі, у іх яскрава выпісан настрой чалавека, стомленага дзённымі клопатамі.

Мы не можам мірыцца з хадульнымі персанажамі, якія ідуць па творах, нібы аршын праглынуўшы, і гавораць прапісныя ісціны. І прыведзеная сцэнка была б дарэчы, калі б мы ўбачылі героя гэтак выразна ў працы. На вялікі жаль, Антон Бялевіч пра асноўнае гаворыць паспешліва, прыблізна. Мікола «людзей тых (недысцыплінаваных калгаснікаў. — С. Г.) ,коравы, натуры ламаў вясною на сяўбе», ён «гарэў душой у працы»... У іншых месцах аўтар характарызуе героя: «як іскра, выбег ён», «і быў, і жыў, жыве заўсёды паміж турбот, паміж трывог», «ён позна ляжа, рана ўстане, няма хвіліны на запас» і г. д. Адчуваючы недастатковасць галаслоўных сцвярджэнняў, паэт недарэмна апеліруе да свядомасці чытача: «і разумееце вы самі, як пад праменнямі, вятрамі за дзень стаміўся верны друг»; «Павіны самі зразумець...» і г. д. Вядома, з такіх «заклінанняў» уявіць сабе героя немагчыма.

У чым асноўны недахоп паэмы Антона Бялевіча? Старшыня, як важак калектыву, мог выявіць і арганізатарскія здольнасці, і чалавечыя свае якасці толькі ў сутыкненні з людзьмі. Паэт жа, хоць і не хацеў, паказаў свайго героя дачнікам-вер, хаглядам. Мы ўпэўнены, што жывы Мікола Аляксейчык цікавы чалавек, што яго літаратурны партрэт не адпавядае сапраўднасці і, зразумела, не можа прэтэндаваць на абагульненне. Могуць запярэчыць, што гэта лірычная паэма і аўтар абмежаваўся асабістымі ўражаннямі і ўспамінамі. Гэта правільна. Але ж твор прысвечаны сучасніку, і яго рысы аўтар павінен бы

Рускі драматычны тэатр імя Горкага паставіў спектакль па п'есе А. Арбузава «Дванаццатая гадзіна». Днямі паглядзець спектакль прыехаў аўтар п'есы. Пасля спектакля А. Арбузаў сустрэўся з калектывам тэатра і падзяліўся сваімі ўражаннямі ад пастаноўкі.

На здымку: А. Арбузаў (у цэнтры) сярод артыстаў тэатра.

Фота Ул. Крука.

Няхай кнігу закажа чытач

— Ніякай рады не дасі гэтым кніжкам. Столькі іх тут — самі бачыце, хіба за кожнай дагледзіш, — скардзіцца Ганна Цішкевіч — загадчыца спецыялізаванага кніжнага магазіна Стаўбцоўскага райспажыўсаюза. — Адны турботы толькі з імі. Да нас жа завозяць літаратуру на ўвесь раён.

Яна ходзіць ля паліц, на ходу паправляе «раўнанне» ў кніжных радах і ўсё скардзіцца, скардзіцца. Але не спачуванне выклікаюць яе скаргі, а нейкую насцярожанасць і недавер.

— У нас адкрыты доступ да кніг,— працягвае яна. — Пакупніку добра, стаіць ля паліц і выбірае, што яму патрэбна. Ну, а нам — адны клопаты: не столькі таго гандлю, колькі непарадку наробяць на паліцах. Ды яшчэ сачы, каб хто якую кніжку за пазуху не паклаў. У нас жа бывае і так...

Здаецца, каб не спыніў яе, Ганна Фёдараўна працягвала б абвінавачваць літаральна ўсіх. Сэнс яе нараканняў зводзіцца да аднаго:

— Стараемся з усіх сіл, а кнігі усё роўна мала хто купляе, — гаворыць яна. — Да нас у асноўным толькі вучні ходзяць, купяць пару пер'яў ці сшыткаў... На гэтым жа плана не выканаеш...

Што ж здарылася? Чаму мінаюць сваю кнігарню многія жыхары раённага цэнтра і працаўнікі калгаснай вёскі?

Днямі ў раённым Доме культуры адбыўся вечар брыгад, што змагаюцца за высокае званне камуністычных. Прыйшлі лепшыя людзі прамкамбіната і птушкакамбіната, калгасаў і чыгункі, устаноў і арганізацый. І кніжны магазін не застаўся ў баку: столік з літаратурай стаяў у фае Дома культуры. Падыйшоў да яго Аляксандр Стома — брыгадзір змены камуністычнай працы станцыі Стаўбцы. Пагартаў некалькі кніжак і адыйшоў ад століка, з дакорам глянуўшы на прадаўца. Не знайшоў для сябе патрэбнай кніжкі і брыгадзір калгаса імя Хрушчова Станіслаў Ліпніцкі. Яго цікавіла літаратура аб вырошчванні цукровых буракоў. І Генадзь Сінякоў з аўтарамонтных майстэрань нічога не купіў, і не таму, што не любіць кнігу, а таму, што не было баявой, надзённай літаратуры.

Літаратуру ўзялі на вечар выпадковую, якая першая трапіла пад руку. Не было на століку кніг аб нашым сучасніку, аб тым, як жывуць і працуюць брыгады камуністычнай працы, пра вопыт перадавікоў.

А варта было Ганне Цішкевіч падумаць, як лепш выкарыстаць гэтую ўдзячную аўдыторыю для распаўсюджвання кнігі. Але дзе там да пошукаў новага, калі не здагадаліся нават зрабіць вітрыну навінак, што атрымаў магазін за апошні час. Застаўся невыкарыстаным і радыёвузел Дома культуры. Ніхто не аб'явіў, якая літаратура ёсць у кнігарні. З цікавасцю праслухалі б прысутныя і бібліяграфічны агляд новай беларускай мастацкай літаратуры...

Літаратуру яшчэ купляюць дрэнна і таму, што самі работнікі кнігарні маюць аб ёй вельмі цьмянае ўяўленне. Што гэта так, лёгка пераканацца, калі зойдзеш у магазін і пазнаёмішся з тым, што ляжыць на яе паліцах. У аддзеле беларускай мастацкай літаратуры я знайшла толькі другі том збору твораў М. Танка (першага зусім не было), па аднаму экземпляру зборнікаў вершаў А. Куляшова і В. Вітка...

Затое на гэтых жа паліцах знаходзяцца кнігі аб барацьбе партызан у дні Айчыннай вайны, аб паўстанні К. Каліноўскага, розная гістарычная і антырэлігійная літаратура. Калі вам спатрэбіцца навукова тэхнічная кніга — вось дакладны адрас: шукайце і яе сярод твораў беларускіх пісьменнікаў.

— Як трапілі сюды гэтыя кнігі? — пытаюся ў загадчыцы кнігарні.

— Гэта, калі рабілі пераацэнку кніг, дык паблыталі нам усё, — ніколькі не бянтэжачыся, адказвае Цішкевіч.

Знаёмімся з сельскагаспадарчым аддзелам. Тут таксама многа кніг, якія не маюць ніякага дачынення да калгаснай вытворчасці.

Актыўныя формы гандлю кнігай укараняюцца надзвычай нясмела. Праўда, кніжныя палічкі або столікі ёсць цяпер ва ўсіх 87 гандлёвых кропках раёна. Тым не менш, план продажу кніг за мінулы год не выкананы. І сёлета магазін працуе нездавальняюча. За студзень і люты трэба было рэалізаваць літаратуры на 5 800 рублёў, а рэалізавана толькі на 3 190 руб. Пад пагрозай зрыву і план сакавіка. Паводле слоў загадчыцы, магазін мае 13 кніганошаў, але хто яны, дзе распаўсюджваюць кнігу, якія вынікі іх работы, на гэтыя пытанні яна не здолела адказаць.

— Нам райком камсамола не адзін раз абяцаў прысласць кніганошаў-камсамольцаў. І мы чакаем іх, а яны ўсё не ідуць, — абураецца Ганна Цішкевіч.

Вядома, дрэнна, што работнікі райкома камсамола забываюць пра свае абяцанні. Ды ці не варта было б самой загадчыцы магазіна дамовіцца са школамі, з кіраўнікамі прадпрыемстваў, калгасаў, устаноў, пагаварыць з моладдзю. І вядома знойдуцца энтузіясты кнігі, якія ахвотна будуць дапамагаць у прапагандзе і распаўсюджванні літаратуры.

Вось ужо колькі месяцаў у рэспубліцы праходзіць падпіска на зборы твораў Я. Коласа і Я. Купалы. Але толькі сярэднія і сямігадовыя школы раёна аформілі падпіску на 20 экземпляраў збора твораў свайго вялікага земляка. А бібліятэкі? А калгасы? А колькі ў раёне жыве і працуе інтэлігенцыі — спецыялістаў сельскай гаспадаркі, настаўнікаў, медыцынскіх работнікаў? Многа! А магазін мае... аднаго індывідуальнага падпісчыка на збор твораў Я. Коласа.

Паводле слоў таваразнаўцы па кнізе Тамары Худушынай, на складзе ёсць творы Я. Купалы, П. Броўкі, М. Танка, П. Пестрака, але іх не так лёгка адшукаць. Таму іх няма на паліцах. А калі б работнікі магазіна завялі картэку наяўнай літаратуры, у любую хвіліну можна было б даведацца, ці ёсць тая ці іншая кніжка.

Нам здаецца, што прычыны дрэннай работы магазіна трэба шукаць у абыякавым стаўленні да заказаў на новую літаратуру. Ад заказаў наогул магазін адмовіўся, пераклаўшы гэтую справу на таваразнаўцу. Вядома, так лягчэй, а галоўнае — адказнасці ніякай.

Заказвае кнігі таваразнаўца Тамара Худушына. Не скажаш, што яна не ведае кнігі. У кнігагандлёвай сетцы Тамара Канстанцінаўна працуе з 1951 г. і ўжо два гады ў райспажыўсаюзе таваразнаўцам. Але якім бы эрудзіраваным не быў адзін чалавек, ён не можа ўлічыць патрэбы чытачоў розных узростаў, прафесій і схільнасцей. Да таго ж, трэба мець і нейкія фактычныя дадзеныя, выходзячы з якіх заказваць тую ці іншую кнігу. Але ні загадчыца магазіна Г. Цішкевіч, ні таваразнаўца Т. Худушына не ведаюць, колькі ў раёне працуе аграномаў, заатэхнікаў, трактарыстаў, даярак, свінарак, птушніц, колькі ёсць урачоў і настаўнікаў і якой спецыяльнасці. Не маюць уяўлення яны, колькі калгасаў сёлета будуць вырошчваць цукровыя буракі, у якіх брыгадах будуць сеяць грэчку, бабовыя і г. д. Тамара Канстанцінаўна спасылаецца, што заказы на сельскагаспадарчую літаратуру ўзгадняліся з работнікамі райсельгасінспекцыі.

Не будзем аспрэчваць, магчыма, гэта так і было. Але нагадаем некалькі фактаў. Ёсць у тэматычным плане Белдзяржвыдавецтва на 1961 г. раздзел сельскагаспадарчай літаратуры. Паглядзім жа, што прыцягнула ўвагу Тамары Худушынай, што яна палічыла важным і надзённым.

У раздзеле аб перадавым вопыце запланавана выдаць 17 назваў кніг і брашур. З іх заказана толькі тры. Па такому ж прынцыпу заказвалася аграномічная і заатэхнічная літаратура.

Можа не пашанцавала толькі сельскагаспадарчай літаратуры? На вялікі жаль, і да іншых раздзелаў выдавецкага плана тое ж абыякавае стаўленне.

Колькі разоў на нарадах работнікаў культуры рэспублікі ішла гаворка аб тым, што самадзейнасць сельскіх культасветустаноў, агітбрыгады не маюць у сваім рэпертуары антырэлігійных твораў. Белдзяржвыдавецтва ўлічыла гэтую слушную крытыку. Сёлета выйдуць у свет аднаактовыя п'есы на антырэлігійныя тэмы. Будзе што ставіць самадзейным артыстам. Толькі гэтага зборніка ў Стаўбцоўскім раёне аматары калгаснай сцэны не знойдуць. Тамара Канстанцінаўна вырашыла, што п'есы — «не хадавы тавар», можна і без іх абыйсціся.

Для аматараў мастацкага чытання рыхтуецца зборнік «Антырэлігійныя вершы беларускіх паэтаў». Але не вельмі радуйцеся. У раён паступіць гэтай кнігі толькі 5 экз. і два экземпляры зборніка «Мы парвалі з рэлігіяй». Паспрабуй, агітатар, арганізаваць індывідуальную работу сярод веруючых, калі патрэбнай кніжкі днём з агнём не знойдзеш. Паэтычныя і драматургічныя творы ў большасці сваёй заказваюцца па 5 экз., крытычныя і літаратуразнаўчыя выданні — па 3 экз. На анталогію беларускай паэзіі і вершы М. Танка зусім няма заказу.

Не першы год прытрымліваюцца ў райсаюзе падобнай заганнай практыкі заказаў. Здзіўляе другое: чаму бескантрольна працуе тав. Худушына і колькі такое становішча будзе працягвацца яшчэ. Калі, скажам, складаецца заяўка на прамысловыя тавары, яе абавязкова паглядзіць, праверыць, нарэшце, падпіша старшыня праўлення райспажыўсаюза тав. Вайнер. А кнігамі, відаць, у райсаюзе не любяць займацца. Церпяць, бо і без іх нельга абыйсціся.

Заказ на літаратуру — вынік калектыўнай думкі, вынік абмеркавання яго сярод шырокай грамадскасці і ў першую чаргу — інтэлігенцыі, перадавікоў вытворчасці, камсамольцаў і моладзі. Так павінна быць. Але інакш робяць у Стаўбцах.

Я. ДАНСКАЯ.
(Спец. кар. «Літаратуры і мастацтва»).

Прэміі за лепшыя песні

У сувязі з сакагоддзем ЛКСМБ у рэспубліцы быў праведзены конкурс на лепшую сучасную песню для дзяцей і юнацтва. На конкурс паступіла 143 песні для хору і сольнага спявання. Журы конкурсу прысудзіла прэміі аўтарам чатырох лепшых песень.

Другую прэмію атрымалі кампазітар Я. Глебаў і аўтар тэксту М. Алтухоў за песню-баладу «Жыць!», пачынаючы кампазітар Б. Магаліф і паэт З. Белавус за песню «Кулічок».

Трэцяй прэміяй адзначаны кампазітар Ю. Семеняка і паэт А. Бачыла, якія стварылі песню «Маладосць, у паход», а таксама кампазітар Р. Пукст (пасмяротна) за маладзёжны хор «Не стрымаць, не спыніць» на вершы Я. Журбы.

ВЕЧАР ПАЭЗІІ

Часта выступаюць перад працоўнымі члены Гомельскага абласнога літаратурнага аб'яднання пры рэдакцыі газеты «Гомельская праўда». Днямі маладыя літаратары наладзілі вялікі вечар паэзіі ў Палацы культуры завода «Гомсельмаш». Камбайнабудаўнікам расказаў аб рабоце гомельскіх паэтаў старшыня літаратурнага аб'яднання пісьменнік Міхась Даніленка. Затым з чытаннем вершаў выступілі інжынеры-чытачнікі Ігар Паляшчук і Анатоль Грачанікаў, настаўнікі Фрыдрых Курас і Ціхан Кажамякін, майстры завода «Гомсельмаш» Міхась Буткевіч і Уладзімір Царэнка, токар механазборачнага цэха Анатоль Кандраценка, супрацоўнік абласной газеты Марат Васілявіцкі, студэнт Уладзімір Отчык, паэт Браніслаў Спрынчан і іншыя маладыя паэты Гомеля.

У Палацы культуры ў час вечара працаваў кніжны кіёск. Многія ўдзельнікі вечара набылі тут новыя творы беларускіх паэтаў і празаікаў.

В. СЯМЕНАЎ.

Любімыя творы

Вялікай папулярнасцю карыстаюцца кнігі беларускіх пісьменнікаў у перакладзе на рускую і ўкраінскую мовы сярод насельніцтва шахцёрскага гарадка Чырвоны Луч Луганскай вобласці. У кніжным магазіне заўсёды можна бачыць шахцёраў, якія купляюць творы беларускіх пісьменнікаў для сваіх асабістых бібліятэк. Многія шахцёры бяруць і чытаюць іх кнігі ў бібліятэках горада. Насельніцтву шахцёрскага горада вельмі палюбіліся кнігі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Петруся Броўкі, Міхаіла Лынькова, Івана Шамякіна і многіх іншых пісьменнікаў. Папулярызуе кнігі беларускіх аўтараў гарадская бібліятэка імя Коупскай. Работнікі бібліятэкі праводзяць з чытачамі абмеркаванне навінак беларускай літаратуры. Нядаўна бібліятэка правяла канферэнцыю чытачоў па кнізе Петруся Броўкі «Калі зліваюцца рэкі». На ёй прысутнічала каля 200 шахцёраў. Зараз гарадская бібліятэка рыхтуецца да канферэнцыі чытачоў па кнізе Івана Шамякіна «Крыніцы».

В. УЛАСЕНКА,
шахцёр.

У НАС — ГОСЦІ З ПРЫБАЛТЫКІ

Выстаўка выяўленчага мастацтва Латвіі ў Мінску

Адкрытая ў залах Дзяржаўнага музея БССР выстаўка выяўленчага мастацтва Латвіі — значная падзея ў мастацкім жыцці рэспублікі. Мінчане не ўпершыню знаёмяцца з выдатным самабытным мастацтвам латышскіх майстроў выяўленчага мастацтва. Карціна мастака О. Скулме «Ул. І. Ленін з латышскімі стралкамі ў Крамлі 1 мая 1918 г.», работа мастакоў І. Зарыня і Г. Клебаха «Латышскія стралкі» ўжо экспанаваліся ў нашым музеі, запомніліся і палюбіліся гледачу. Зразумела, што грамадскасць сталіцы Беларусі з нецярпліваццю чакала адкрыцця вялікай выстаўкі, якая дае больш поўнае ўяўленне пра дасягненні сённяшняга латышскага мастацтва.

На выстаўцы экспанавана больш 300 лепшых твораў жывапісу, графікі, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога і народнага мастацтва, створаных у Латвіі ў асноўным за апошнія некалькі год і паказаных на юбілейнай выстаўцы мінулага года ў Маскве.

Асноўная тэма большасці прадстаўленых твораў — мірнае, стваральнае жыццё працаўнікоў братняй рэспублікі, а галоўны герой — чалавек працы. Іменна яму прысвечаны самыя цікавыя творы, прасякнутыя настроем бадзёрасці, сілы і маладосці.

Радаснае светаадчуванне ёсць у карціне І. Зарыня «Якая вышыня!» Сонцам і святлом напоўнена блакітнае неба, на фоне якога відаць моцныя фігуры будаўнікоў. Усе мастацкія сродкі падпарадкаваны тут галоўнай тэме — героіцы чалавечай працы.

Раскрыццю рыс сучасніка прысвечана і другое палатно гэтага ж мастака «У нас ужо крокві. Дом падведзены пад дах». Свежасцю павявае ад гэтай карціны, якая дае манументальны вобраз будаўнікоў новага жыцця. Адчуваннем маладосці вабіць карціна Я. Осіса «Спаборніцтвы па грэблі на свяце латышскіх рыбакоў». Энергічнымі і моцнымі паказаны тут працаўнікі мора.

Жыццё латышоў звязана з морам, таму так многа ўвагі аддаюць мастакі Латвіі тэме: чалавек і мора. Найбольш запамінальныя карціны на гэтую тэму належаць народнаму мастаку Латвійскай ССР Э. Калныню («Рыбалавецкі пасёлак Дунтэ» і «Яхтклуб»).

Нямала работ прысвечана гераічным старонкам нядаўняга мінулага — Вялікай Айчыннай вайне. Вялікай эмацыянальнасцю вызначаецца палатно латышскага жывапісца Г. Мітравіца «Латгальскія партызаны». Як гімн героям гучыць гэты твор пра партызан, якія выходзяць з няроўнага бою і нясуць паранены таварыша. Умоўны белы фон, востры напружаны малюнак ствараюць адчуванне трывогі, усхваляванасці і разам з тым упэўненасці ў сіле барацьбітоў.

Багата на выстаўцы партрэтаў. Можна пералічыць нямала выдатных твораў гэтага жанра, у якіх адлюстраваны вобразы герояў латышскага народа. Сярод іх у першую чаргу трэба назваць востры, яркі індывідуальны скульптурны партрэт Яна Райніса работы К. Зэмдега.

Выдатныя партрэты работы скульптара Г. Залькалка даюць глыбокія псіхалагічныя характарыстыкі. Высокім майстэрствам вызначаецца яго «Партрэт студэнткі Мальды», выкананы ў тонкай пластычнай манеры. Цікавы жывапісны партрэт мастака І. Зарыня, выкананы Л. Кокле. Запамінаюцца і графічныя партрэты маладога мастака Ф. Паўлюк. Гэты майстар глыбока пранікае ў характар вобраза, умела выкарыстоўвае графічныя прыёмы, ствараючы галерэю мужных, дужых людзей.

Гарачая любоў да роднага краю, яго непаўторнай прыгажосці, пазітычнае бачанне прыроды ўвасоблены ў многіх пейзажах. Пяшчотную прыгажосць родных месц, іх мяккую абаяльнасць здолелі перадаць у своеасаблівых па творчай манеры работах і старэйшы прадстаўнік рэалістычнага напрамку ў латышскім мастацтве народны мастак рэспублікі К. Мієснік, і Э. Калнынь. І многія іншыя.

Шырокі панарамны пейзаж латышскай сталіцы стварае мастак К. Мельбардзіс у карціне «Рыга». Тут выдатна перададзены і велічны спакой вод Даўгавы і тонучыя ў зеляніне набярэжныя.

Урачыстасцю і цішынёю павявае ад пейзажаў В. Калнрозэ. Яго «Рачны пейзаж» бясспрэчна адзін а лепшых на выстаўцы.

Разнастайна і цікава прадстаўлены на выстаўцы латышскія графікі, якія працуюць у рознай тэхніцы і радуюць мноствам індывідуальных почыркаў. Ксілагравюры, афорты і літаграфіі расказваюць пра сённяшняе жыццё латышскага народа. Вялікай разнастайнасцю вызначаюцца акварэлі латышскіх мастакоў. Ім уласцівыя сакавітасць і смелае выкарыстанне колеру, шырокая манера пісьма. Серыя «Сталіцы Прыбалтыйскіх рэспублік» Я. Брэктэ вызначаецца віртуозным тэхнікай, а галоўнае, імкненнем мастака раскрыць своеасаблівасць кожнага з прыбалтыйскіх гарадоў.

Нельга не захапляцца прадстаўленымі на выстаўцы творамі прыкладнога мастацтва. Высокае прафесіянальнае майстэрства і тонкі мастацкі густ спалучаюцца ў працах латышскіх каруначніц і вязальшчыц, аўтараў мастацкіх вырабаў з бурштыну і дрэва, металу, тканіны, шкла і г. д. Майстры-керамісты ствараюць простыя па форме і малюнку прывабныя рэчы, якія могуць служыць лепшым упрыгожаннем сучаснага інтэр'ера і ў той жа час маюць чыста ўтылітарнае прызначэнне.

Нацыянальныя традыцыі ўмела выкарыстоўваюць многія майстры па роспісу дэкаратыўных тканін. Назавём шалікі Э. Рубаніэ, І. Энгеліс, цыноўкі А. Эльтэрман.

Выстаўка ва ўсіх яе раздзелах сведчыць аб значным росце выяўленчай творчасці Латвіі за гады Савецкай улады. І разам з тым трэба зазначыць, што ў іншых творах не вынішчаны яшчэ сляды фармалізму, які некалі прадстаўляў сур'ёзную небяспеку для латышскага жывапісу.

Некаторыя мастакі ставяць сваёй мэтай выражэнне ў карцінах чыста жывапісных задач, не клапоцячыся пра значнасць зместу. Ці можа такое мастацтва крануць сэрца гледача? Бясспрэчна, не.

Характэрная ў гэтым сэнсе карціна «Перад дажджом» мастака А. Таропіна. У ёй усё настолькі ўмоўна, што гледачу зусім немагчыма пранікнуць у змест карціны, калі ўвогуле такі ёсць. Сіні, некалькі едкі фон, на пярэднім плане нібы павіслая ў паветры жанчына. Чаму ўсё гэта называецца «Перад дажджом» — не зразумела. Бадай тое ж мы сустракаем і ў пейзажы «Вясна» мастака А. Скрыдэ. У карціне яркія мазкі, але няма настрою, уяўлення вясны, што хацелася б адчуць у гэтай карціне.

Многія майстры злоўжываюць прыглушанай танальнасцю жывапісу, што апраўдана ў пейзажах, але вельмі шкодзіць у жанравых рэчах.

Агульнае ўражанне ад выстаўкі радаснае і прыўзнятае. Выяўленчае мастацтва праўдзіва адлюстроўвае жыццё і працу людзей Савецкай Латвіі.

Э. ВАРАШЫЛАЎ,
старшы навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага мастацкага музея БССР.



З ЛАТВІЙСКАЙ МАСТАЦКАЙ ВЫСТАЎКІ.
Г. Мітрывіц. «Латгальскія партызаны».

Гартаючы даўнія выданні

У гісторыі знаёмства зарубежнага чытача з беларускай літаратурай выразна відаць два этапы. Калі да рэвалюцыі 1905—1907 гадоў беларуская мастацкая літаратура амаль не выходзіла за межы славянскага свету, дык пасля Кастрычніка папулярнасць новай беларускай літаратуры за рубяжом непараўнальна вырасла. Цікава, што ў нашым літаратуразнаўстве доўгі час быў распаўсюджан погляд, што да 30-х гадоў аб беларускай літаратуры пісалася выключна ў славянскім друку. Аднак гэта не так.

Да апошняга часу звесткі аб распаўсюджванні беларускай літаратуры за мяжой былі няпоўнымі. Вядома было, напрыклад, што адзін том манаграфіі Карскага, прысвечаны беларускай літаратуры, быў выдадзены ў Германіі ў 1927 г.

Бібліёграф Н. Ватацы навяла аўтара гэтых радкоў на думку пазнаёміцца з перакладамі купалаўскіх вершаў у нямецкай анталогіі І. Калмера. Пры азнаямленні з анталогіяй «Еўрапейская лірыка сучаснасці», якая была выдадзена ў Ляйпцыгу і Вене ў 1927 г., выявілася, што гэтае выданне ўключала не толькі пераклады вершаў Я. Купалы, але і некалькі вершаў Я. Коласа, М. Багдановіча і Зм. Бядулі. Складальнік анталогіі І. Калмер, імкнучыся прадставіць усё значнае ў еўрапейскай паэзіі за чвэртку стагоддзя (на титуле даты: 1900—1925) даў галоўным чынам у сваіх перакладах рад вершаў С. Неймана і І. Вольнера, У. Зейферта і В. Незвала, А. Сову і П. Безруча, П. Тычыны і М. Рыльскага, Я. Купалы, М. Багдановіча, Я. Коласа і Зм. Бядулі, Юл. Тувіма, Ул. Бранеўскага, Р. Стандэ. Такім чынам, выбар паэтаў быў дастаткова шырокі. Натуральна, што І. Калмер не мог прапанаваць раўназначных арыгіналам перакладаў, і гэта яскрава відаць, калі параўноўваеш вершы Я. Коласа і Зм. Бядулі ў перакладах І. Калмера з арыгіналамі. Больш удаліся два пераклады з Я. Купалы і М. Багдановіча. Да асобных раздзелаў анталогіі І. Калмер напісаў вялікія, але даволі тэндэнцыйныя ўводзіны ў форме эцюдаў. Ва ўступе да «Лірыкі славянскіх народаў» І. Калмер яўна перапявае даволі старыя «адкрыцці» аб адрозненнях раманскай і славянскай душы. Ён піша, што паэзія славакаў, беларусаў і украінцаў вырастае галоўным чынам з прыродаапісальнай лірыкі і балады, якая караніцца ў казачнай паэзіі. На думку І. Калмера, сюжэты беларускія паэты бяруць у казках і... нічога ў рэвалюцыйнай рэчаіснасці!.. Гэта гучала тым больш тэндэнцыйна, што ў раздзеле рускай паэзіі былі прадстаўлены А. Блок, С. Ясенін і Ул. Маякоўскі, а ў каментарыях знайшліся словы аб паэме «Дванаццаць», аб рэвалюцыйнай паэзіі Маякоўскага.

Аглядныя матэрыялы, інфармацыя аб беларускай літаратуры на парозе 30-х гадоў з'яўляліся ў еўрапейскай замежнай прэсе ўсё больш часта. Магчыма, што адным з вытокаў гэтай інфармацыі ў тыя гады была прэса эсперантыстаў, якія былі вельмі актыўнымі ў Беларусі і, як вядома, звярнулі на сябе ўвагу М. Горкага.

У 1929 г. парыжскае выдавецтва Андрэ Дэльфо выпусціла кнігу Рэне Мартэля «Беларусь. Эцюды гістарычныя, эканамічныя і геаграфічныя». Ва ўступе аўтар піша, што крыніцай для вывучэння сучаснай Беларусі яму паслужыў даклад СНК БССР за 1928 г. саюзнаму ўраду. У гэтай працы пытанням культуры наогул і літаратуры ў прыватнасці прысвечан толькі невялікі раздзел. Аўтар коратка паведамляе аб першых беларускіх пісьменніках і этнографах Я. Чачоце, Я. Баршчэўскім, называе паэму «Тарас на Парнасе». На старонках, прысвечаных літаратуры XIX стагоддзя, Рэне Мартэль піша аб сувязях Дуніна-Марцінкевіча з Ул. Сыракомлем і Ст. Манюшкам.

Пра Ф. Багушэвіча французскі аўтар піша, што ён сфармаваўся як паэт у Пецярбурзе пад уплывам ідэй Бялінскага, Дабралюбава, Чарнышэўскага, Салтыкова-Шчадрына, Някрасава. Р. Мартэль зазначае, што «Фр. Багушэвіч быў паранены ў час польскага паўстання, а затым займаў на вёсцы сціплую пасаду настаўніка і судовага служачага. Гэта дало яму магчымасць глыбока пазнаць жыццё беларускага сялянства, зразумець яго імкненні і сацыяльныя бедствы». Р. Мартэль гаворыць аб велізарным уплыве Ф. Багушэвіча і Я. Лучыны на наступнае пакаленне нацыянальнай інтэлігенцыі.

З рэвалюцыйнай 1905 г. французскі аўтар звязвае творчасць А. Пашкевіч (Цёткі), «якая вылучалася палымянасцю сваіх перакананняў» і «двух нацыянальных паэтаў сялянскага паходжання Я. Купалу і Я. Коласа, пад уплывам якіх развіваецца літаратура гэтага часу». Праўда, Р. Мартэль зусім не слушна заўважае, нібыта шляхі гэтых паэтаў у літаратуры разыйшліся: «Я. Купала схіляецца да рамантычнага сімвалізму, а Я. Колас — да рэалізму».

1910 годам Р. Мартэль датуе з'яўленне зусім новага пакалення пісьменнікаў — А. Гурло, Ц. Гартнага, Зм. Бядулі і інш. і піша пра М. Багдановіча. «Яго лірычны талент адарадзіў усе формы паэзіі, нават санет, не пагарджаючы тымі нацыянальнымі традыцыямі, якія прасякаюць усе лепшыя творы дадзенага перыяду».

Р. Мартэль указвае, што Кастрычнік быў магутным штурфіком для беларускага нацыянальнага руху. «...За нямецкай акупацыяй наступіла белапольская. Янка Купала, Зм. Бядуля сталі выказнікамі вострага абурэння народа супраць новага варварства». Аўтар піша, што мінская газета «Вольная Беларусь» (відаць, «Советская Белоруссия». — **Д. Ф.**) апублікавала першую частку паэмы Я. Коласа «Сымон-музыка», якая нібыта засталася ў літаратурных колах незаўважанай. Ён вылучае момант станаўлення беларускай пралетарскай літаратуры і называе імя М. Чарота.

У літаратуру прыходзіць новае пакаленне пісьменнікаў: Ул. Дубоўка, А. Александровіч, А. Дудар, Цішка Гартны. Пра апошняга сказана, што ён «вывучае псіхалогію маладога пакалення і яго арыгінальныя творы варты доўгага жыцця».

Р. Мартэль спыняе ўвагу на культурнай рэвалюцыі. Ён піша: «...быў адроджаны беларускі тэатр, мова заняла ў грамадскім жыцці тое месца, на якое яна мела права». Аўтар карыса, няхай вельмі лаканічна, але ўказвае на такія факты культурнага жыцця, як «заснаванне выдавецтва «Савецкая Беларусь», якое выдавала класікаў і падтрымлівала маладых літаратараў». Французскі аўтар дае агульную, у многім спрэчную, характарыстыку літаратурных аб'яднанняў і іх друкаваных органаў. Ён адзначае, што Я. Купала і Я. Колас у новых умовах абнаўляюць сваю тэматыку, ствараюць шматлікія рэвалюцыйныя вершы, паведамляе, што Я. Купала пераклаў на беларускую мову «Інтэрнацыянал».

Нарыс Р. Мартэля пра беларускую літаратуру адыграў станоўчую ролю ў азнаямленні французскага чытача з фактамі літаратурнага жыцця Беларусі. Трэба ўспомніць, што буржуазная прэса тых год была напоўнена антысавецкінай, звесткі ж і ацэнкі, дадзеныя ў гэтых эцюдах, былі добразычлівымі.

Цікавы ў эцюдах Р. Мартэля сам факт паказу эвалюцыі беларускай літаратуры пад уплывам рэвалюцый 1905 і 1917 гг., у той час, як у выдадзенай у Ляйпцыгу анталогіі сучаснай еўрапейскай лірыкі прадстаўлены толькі дарэвалюцыйныя вершы Я. Купалы, М. Багдановіча, Я. Коласа і Зм. Бядулі.

Д. ФАКТАРОВІЧ.

★

МАСКВА. Цэнтральны тэатр Савецкай Арміі паказаў гледачам новы спектакль — п'есу малдаўскага пісьменніка Іёна Друцэ «Каса Марэ». Рэжысёр—В. Львоў, мастак—М. Мукасеева.

На здымку: сцэна з першай дзеі. Злева направа: Сафійка — артыстка **М. Скуратава**, Васіліца—народная артыстка РСФСР **Л. Дабржанская**, Павэлаке — артыст **Б. Пяцелін**.

Фота Н. Куляшова.
Фотахроніка ТАСС.

★

ПІСЬМЫ Ў РЭДАКЦЫЮ

Патрэбен букіністычны магазін

Два гады ідзе размова пра тое, што Гомелю патрэбен магазін букіністычнай кнігі. Пра гэта пісала і абласная газета.

Гамяльчане чакалі, што з адкрыццём на праспекце імя Леніна новай вялікай кнігарні ў ёй будзе створан букіністычны аддзел. Але чаканні аказаліся дарэмнымі.

Дырэктар аблкнігагандлю І. Вяршэня спачатку тлумачыў, што адкрыць букіністычны магазін нельга з-за адсутнасці памяшкання. Калі ж памяшканне з'явілася, ён стаў спасылацца на адсутнасць спецыяльных каталогаў.

Прайшло ўжо больш года. Няма ні каталогаў, ні магазіна.

Нядаўна ў Гомелі пабываў работнік Мінскага букіністычнага кніжнага магазіна. За тыдзень ён набыў у горадзе некалькі дзесяткаў рэдкіх выданняў. Крыўдна, што гамяльчане ад гэтага нічога не выйгралі, калі не лічыць выручкі ад прададзеных кніг.

Р. ЗАЙЦАЎ.

Было ў Рэчыцы літаб'яднанне...

Пяць год назад было створана літаратурнае аб'яднанне пры рэчыцкай раённай газеце «Зара камуны». Да 1960 г. яно плённа працавала: рэгулярна праводзіліся заняткі, на якіх абмяркоўваліся творы пачынаючых, конкурсы, выпускаліся літаратурныя старонкі. Быў наладжаны літаратурна-музычны вечар для слухачоў універсітэта камуністычнага выхавання. Намячаліся выезды ў калгасы і на прадпрыемствы. На жаль, яны не ажыццявіліся з-за хваробы кіраўніка літаб'яднання Васармана. А на яго месца і да гэтага часу нікога не выбралі. І літаб'яднанне больш года без кіраўніка і таму не працуе. А рэдактара т. Жлоба гэта не хвалюе.

Ці не час аднавіць работу літаб'яднання пры раённай газеце?

П. КРУК,
член літаб'яднання.

ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

Аб савецкай маралі

У 86 нумары нашай газеты за мінулы год быў змешчаны артыкул А. Мальдзіса, у якім расказана сумная гісторыя жаніцьбы па прымусу, якая адбылася ў вёсцы Расолы Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці.

Астравецкі РК КПБ разгледзеў факты, аб якіх паведамлялася ў артыкуле.

Каб палепшыць прапаганду новых традыцый у раёне, райком распрацаваў рад мерапрыемстваў. У калгасе «Шлях Леніна» (в. Расолы) настаўнікі і лектары райкома КПБ прачыталі лекцыі і даклады па навуковаму атэізму, аб савецкай маралі.

КАБ ВЫЯВІЦЬ ЗДОЛЬНУЮ МОЛАДЗЬ

Работнікі Гродзенскага музычнага педвучылішча прапанавалі стварыць пры раённых музычных школах пастаянныя кансультацыйныя пункты, каб выявіць таленавітую моладзь.

Некалькі дзён назад гродзенцы далі ў Навагрудку кансультацыю, правялі заняткі, якія паказалі, што ў раёне шмат здольных людзей.

Пачынаючыя пачулі шмат карысных парад, як развіваць слых, рыхтавацца да паступлення ў музычныя навучальныя ўстановы.

Работнікі гэтага ж вучылішча правялі ў раённым цэнтры семінар выкладчыкаў музыкі і спеваў, на якім прысутнічала больш 50 чалавек. Адбылося развучванне песень і танцаў пад акампанемент домры і піяніна. Заняткі па вакальна-харавой грамаце праводзілі метадысты Н. Пятушка і Ю. Скварцова.

Д. ЗІНГЕР.

НОВЫ СПЕКТАКЛЬ

Учора Беларускі рэспубліканскі Тэатр юнага гледача паказаў мінчанам новы спектакль па п'есе А. Успенскага «Дзяўчына з вяснушкамі». Спектакль паставіла галоўны рэжысёр тэатра, заслужаны дзеяч мастацтва БССР Л. Мазалеўская. Мастацкае афармленне В. Кляшчэўскага.

У спектаклі заняты артысты П. Дубашынскі, Л. Цімафеева, Ю. Фляйто і інш.

ІДЗЕ ДВУХМЕСЯЧНІК ПРАПАГАНДЫ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ

РАЗАМ З АКТЫВІСТАМІ

У нашай бібліятэцы каля 800 чытачоў. Цяжкавата стала цяпер задавальняць іх попыт на сельскагаспадарчую літаратуру. Людзі цікавяцца перадавымі метадамі працы, а кніжак пра гэта мясцовыя кнігарні прадаюць мала, ды і з бібкалектара дасылаюць не вельмі многа.

Мы прапагандуем не толькі кнігі і брашуры па сельскай гаспадарцы, але і газеты «Сельская жизнь», «Калгасная праўда». Да кніжных паліц у нас свабодны доступ. Пастаянна абнаўляем кніжныя выстаўкі — «Чытайце літаратуру па жывёлагадоўлі», «Насустрач веснавой сяўбе» і інш. Афармілі стэнд: «Што нам трэба зрабіць, каб патэрмінова выканаць заданні сямігодкі».

Актывісты бібліятэкі ў чырвоных кутках на жывёлагадоўчых фермах вывесілі рэкамендацыйныя спісы літаратуры, стэнды, плакаты.

У брыгадах праводзяцца вечары пытанняў і адказаў на сельскагаспадарчыя тэмы. Цікава прайшлі такія вечары ў вёсках Нежкаўка, Асінаўка і Грабалава.

У аддзяленнях саўгаса праводзіліся вечары, прысвечаныя вынікам работы ў 1960 г. і задачам трэцяга года сямігодкі. Бібліятэка таксама прыняла ў іх удзел. Свінарка т. Крыважубава, даярка т. Радзькова, цялятніца тт. Іванова і Карпачова і іншыя перадавыя жывёлаводы гаварылі пра поспехі ў працы, расказалі пра карысць, якую яны атрымалі ад чытання сельскагаспадарчай літаратуры.

На фермах і ў брыгадах мы часта наладжваем калектыўныя чыткі найбольш цікавых артыкулаў з газет і часопісаў, абмеркаванне брашур пра перадавыя метады працы жывёлаводаў і хлебаробаў.

Днямі на пасяджэнні савета бібліятэкі абмеркавана пытанне аб ходзе двухмесячніка прапаганды сельскагаспадарчых ведаў. Намечана ў кожнай брыгадзе правесці вечары, прысвечаныя перадавым калгаснікам. Рыхтуем канферэнцыі чытачоў на тэмы «Вырошчванне кукурузы» і «За высокія надоі малака».

А. НОВІКАВА.
загадчыца Асінаўскай сельскай бібліятэкі Чавускага раёна.

Сустрэліся былыя вязні Асвенціма

Гэтая сустрэча адбылася ў доме адпачынку «Орша».

...Быў пахмурны дзень, імжыў дождж. На сцяжынцы, што вяла да дома адпачынку, з'явілася сярэдняга росту жанчына. Каля першага корпуса яна спынілася. Спытала, як прайсці да клуба.

Мы пазнаёміліся. Гэта была адна з аўтараў кнігі «У фашысцкіх засценках» Надзежда Цвяткова. Многія з нас ужо ведалі, што яна перанесла нечалавечыя пакуты ў гады вайны. Таму была зразумела наша асаблівая цікавасць да гэтай сустрэчы.

Хутка клуб пачалі запаўняць адпачываючыя.

Калі зала сціхла, Надзежда Цімафееўна пачала расказваць.

Прысутныя з напружаннем слухалі. І не ведала Цвяткова, што асабліва ўважліва нехта ўглядаецца ў яе. Як толькі Надзежда Цімафееўна скончыла гутарку, наперад праціснулася маладая яшчэ з твару, але з сівымі, як і ў Надзежды Цімафееўны, валасамі жанчына.

— Я таксама была ў Асвенціме, — ціха паведаміла жанчына.

— Які нумар?

— 69109, — напамяць адказала жанчына.

— Дарагая мая! Мы ж з табою былі...

І абедзве яны заплакалі. І ў гэтай кароткай успышцы чалавечай слабасці ўсе зауважылі горыч перажытага і радасць жыцця.

То была Ніна Арцёмаўна Савіцкая, работніца завода Асінторф. Сама яна з Віцебскай вобласці. Яе схапілі немцы разам са старэйшай сястрой Ефрасінняй за сувязь з партызанамі. Ефрасіння памерла ў лагеры на руках у Ніны, а яе самую выратавала ад смерці Савецкая Армія.

І вось праз колькі год сустрэліся былыя вязні. Надзежда Цімафееўна запісвае адрас Савіцкай і жанчыны дамаўляюцца пісаць адна адной.

М. АУСЕЕНКА.

Навіны культуры

Вялікая дружба звязвае Тэатр імя Янкі Купалы і адну са старэйшых навучальных устаноў краіны Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Артысты тэатра — частыя госці ў Горках.

Нядаўна калектыў тэатра зноў наведаў Горкі і паказаў спектакль «Вострай Афрадзіты» па п'есе грэчаскага пісьменніка А. Парніса. У спектаклі прынялі ўдзел Л. Ржэцкая, С. Бірыла, В. Галіна, З. Браварская, М. Яроменка, П. Іваноў і іншыя.

В. МІТРАЕЎ.

* * *

Калектыў мастацкай самадзейнасці ў Лельчыцкай сярэдняй школе № 1 створаны нядаўна, але ён ужо заваяваў аўтарытэт у гледачоў. Вучні тройчы выступалі на сцэне раённага Дома культуры, а таксама перад калгаснікамі многіх сельгасарцелей раёна.

Вялікія планы ў юных артыстаў. У бліжэйшы час намячаецца выезд з канцэртамі ў суседні калгас імя Сталіна і Славячынскі раён братняй Украіны.

П. ШЫБУТ.

* * *

Чатыры дні праходзіў семінар работнікаў культасветустаноў Дубровенскага раёна, на якім прысутнічала каля 40 загадчыкаў сельскіх клубаў і бібліятэк, кіраўнікоў гурткоў мастацкай самадзейнасці.

Удзельнікі семінара абмяняліся вопытам работы, праслухалі некалькі метадычных лекцый і гутарак па разнастайных пытаннях культасветработы на вёсцы.

А. МАЦЫЛЕВІЧ.

Агонь душы

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Чалавек заўсёды спадзяецца на шчасце, дамагаецца яго працай, стараннасцю. Але здараецца, што немаведама адкуль возьме ды і вырыне гора. Здарылася гэтак і ў маладой сям'і. Быў тады вельмі неспакойны, трывожны трыццаць сёмы год. Ці то нейкаму хціўцу кінулася ў зайздросныя вочы шчасце электразваршчыкаў Алены і Івана і ён захацеў разбурыць яго, ці з якой іншай чорнай мэтай: нехта напісаў у партыйны камітэт дэпо ананімку—маўляў, Іван Назарэнка гэта не той, за каго ён сябе выдае: не камсамолец, не перадавік вытворчасці, а класавы вораг. Ён, маўляў, утаіў ад камсамола, ад кіраўніцтва дэпо, што ён не хто іншы, як сын памешчыка Лісоўскага, а на чыгуначны транспарт, відаць, пралез, каб шкодзіць ціхай сапай.

Алена, як даведалася пра гэтую ананімку, дык ледзь не самлела. Няўжо ж Ваня, сапраўды такі? Няўжо ён утаіў ад яе сваё паходжанне? Яна цяпер па-новаму асэнсавала і тое, што калі паміж імі заходзіла гаворка пра Іванавага бацьку, дык ён унікаў яе, стараючыся перавесці на што іншае. Але цяпер Алена настаяла, і Іван вымушаны быў расказаць усё тое, пра што яму расказвала маці.

...З маладых год Іванава маці служыла за пакаёўку ў пана Лісоўскага. Дзяўчына яна была паглядная і кінулася ў вока маладому панічу, і той пачаў спакушаць яе. Яна мо' на момант і паверыла. Гэтак паніч і прыстараўся пакаёўцы сына. А калі нарадзіўся сынок, стары пан выгнаў пакаёўку, сказаўшы, каб яе і нагі не было больш у пакоях. Ратуючыся ад знявагі і сораму, маладая маці з'ехала аж у Харкаў, дзе і падрос маленькі Іванка, не ведаючы не тое, што бацькавай ласкі, дык нават імя яго.

І вось больш, як праз дваццаць год Івану давялося спавядацца ў матчыных грахах не толькі перад жонкаю, дык і перад калектывам камсамольцаў, перад кіраўніцтвам дэпо. Іван усёй душой ненавідзеў таго бацьку, якога ён яі разу і ў вочы не бачыў, ненавідзеў той клас, да якога належаў бацька. А яго абвінавачваюць у тым, што быццам ён, камсамолец, рабочы чалавек, варожы па крыві таму грамадстаў, якое паставіла яго на ногі, вывела ў людзі. Яго выключылі з камсамола, зволілі з работы ў дэпо 'як класавага ворага. Алене цяжка было стрываць усё гэта. Трэба было змагацца за любага чалавека, і яна пайшла спачатку ў дэпоўскі камітэт камсамола.

— Што гэта вы робіце з маім Іванам?—з гневам папытала яна ў сакратара.

— А тое, што трэба рабіць з класавым ворагам, — спакойна, быццам ішла гаворка пра сапсаваную дэталь, а не пра лёс чалавека, адказаў сакратар.

— Які ж ён і чый вораг? Мой ці твой? Ён жа рабочы чалавек з самога свайго маленства. Я яго лепш за вас ведаю.

— Ты толькі ведаеш абалонку, а які пад ёй стрыжань, ты ж не бачыш. У душу ж яму не заглядала. А калі ты гэтак абараняеш яго, дык, мусіць, і сама такая.

— Такая, як ён. Хачу быць такой. Добра было б, каб і ты быў такі! — аж крычала Алена.

У Алены Паньковай пасля гэтай гаворкі, як бы што абарвалася ў сярэдзіне, і яна не магла знайсці ні слоў, нічога, чым бы можна ўпікнуць сакратара, апраўдаць мужа. Кінулася ў дзверы і ўжо нахаду крыкнула:

— Я найду праўду, я давяду, што мой муж—сумленны чалавек.

Праз колькі часу Панькова сядзела перад сталом сакратара абкома камсамола, расказвала пра сябе, а найбольш пра свайго Івана. Як ёй здалося, сакратар слухаў вельмі ўважліва, не перабіваў яе, толькі зрэдку ўстаўляў якое слова, ці далікатна пытаў што-кольвек, і Алене здалося, што яна натрапіла на таго чалавека, які яе да канца зразумее і не толькі паспагадае гору, але дасць якой рады. Але як толькі Алена скончыла расказваць пра мужа, пра сябе, сакратар трошкі яшчэ памаўчаў, падумаў, а потым спакойна, нават, як здалося Алене, абыякава, сказаў:

— Ты, таварыш Панькова, хоць і камсамолка, але не ведаеш законаў класавай барацьбы, не ведаеш, што яна ў цяперашні час набывае зусім іншыя формы. Ворагі народа цяпер вельмі часта апранаюць рабочую блузу, прыкрываючы ёю сваю класавую сутнасць. А чым жа ты гарантавана, што твой муж не той самы класавы вораг. Навошта ж бы ён таіў нават ад цябе сваё класавае паходжанне, калі б у яго былі добрыя намеры. Ён проста замаскіраваўся пад перадавога рабочага, а ты па сваёй палітычнай блізарукасці і паверыла яму.

— Няпраўда ўсё гэта! Усё гэта выдумкі. Мой Іван больш чэсны, чым ты сам,—узлавана крычала Алена.

— Ну, што ж, калі вы так ваяўніча памыляецеся,—з металам у голасе казаў сакратар, — то давядзецца і вас лячыць. Ні партыя, ні яе дзеці шча камсамол не пацерпяць палітычнай блізарукасці, тым больш слепаты, на якую хварэеце вы.

З сакратаровага кабінета Алена не пайшла ні ў дэпо, ні дадому. Яна чамусьці пабрыла за горад, у поле. Там усё цвіло, красавала, а яна, ідучы разораю, думала бог ведама што. І мо' толькі птушкі, якія заліваліся бесклапотным шчэбетам, ды краскі, што цвілі-буялі вакол, нагадалі жанчыне, што дома дзеці, што ім трэба жыць, усміхацца, і яна адагнала страхоцце і з усіх ног кінулася дадому.

Добра, што благое, горкае ў жыцці чалавека нядоўга цягнецца, а на змену яму прыходзіць радасць, якая пасля перажытага здаецца яшчэ больш светлай і жаданай. Алена сваёй настойлівасцю дамаглася таго, што той паклёп, які быў узведзены на Івана, а значыць і на яе, адмёўся. І яны зноў у рабочым калектыве заваявалі тое месца, якое па праву ім належала. У працы ўсё забывалася, яна здымала, як рукой, згрызоты, непрыемнасці. А працавалі Алена з Іванам, стараючыся адно перад адным, шукаючы такіх спосабаў, каб як мага найбольш зрабіць. Дагэтуль спрацаваныя колы вагонаў каварваліся некалькімі швамі. Гэта, па-першае, брала многа часу, а, па-другое, ускладняла апрацоўку швоў. Алена доўга думала і нарэшце прапанавала наварваць адным швом. Эксперымент удаўся. Інжынеры, тэхнікі, рабочыя дэпо зразумелі, што гэтая, здавалася б, простая, навіна тоіць у сабе найвялікшыя магчымасці паскарэння і паляпшэння працы. Пра Алену Паньковy і пра яе мужа Івана Назарэнку, які адразу ж пераняў метад работы жонкі, пачала пісаць газета «Железнодорожник Белоруссии», якая тады выходзіла ў Гомелі.

Асабліва запомніліся Алене і Івану дні першай Дэкады беларускага мастацтва і літаратуры ў Маскве. У складзе самадзейнага калектыву клуба чыгуначнікаў горада Гомеля і яны выступалі перад масквічамі, паказвалі самабытнае мастацтва свайго народа.

ПАЛАЛІ пажары, асвятляючы злавесным полымем пануры, прыцішлы родны горад. Выбухі бомб аж скаланалі зямлю. Дэпо было ўжо разбіта, але людзі ўсё роўна прыходзілі на работу, хоць іх нічто не зваў, не загадваў ім. Мабыць, кожны чалавек перад варожым нашэсцем адчуваў трошкі і свае віны, што да вайны рабіў мала, каб не дапусціць таго, што цяпер дзеецца на роднай беларускай зямлі. «Юнкерсы» раз-пораз заходзяць хвалямі, пікіруюць на чыгуначны вузел, на ПВРЗ, на бензасховішча. Ужо вялізныя бензінавыя бакі, што стаялі ў засені дрэваў непадалёк ад Палескага пераезду, гараць страшэнным пякельным полымем. Клубы чорнага дыму ўздымаюцца над горадам, і здаецца, што гарыць не толькі горад, а ўвесь белы свет. Быццам і сонца не стала над ім, быццам у блакіце неба адно што і плаваюць фашысцкія пікіроўшчыкі, якія толькі і ведаюць абрынаць на зямлю страшэнныя грымоты смерці.

На чыгуначных пуцях спехам грузілася абсталяванне ПВРЗ, Гомсельмаша, паравозная і вагоннага дэпо. Горад рыхтаваўся да эвакуацыі. Сярод тых, хто грузіў абсталяванне для адпраўкі ў глыбокі тыл, былі і Панькова з Назарэнкам. Дома калаціліся, плакалі дзеці, пакінутыя на догляд сваякрухі. Па горадзе поўзалі, як здрадныя цені, чуткі: быццам немцы падыйшлі ўжо да самага Сожа, ім астаецца адно пераправіцца, і Гомель будзе іх. Рабочыя адзін у аднаго пыталі рады, што рабіць. Каторыя, у каго не было вялікай сям'і, прыладжваліся да эшалонаў з абсталяваннем і ехалі немаведама куды, абы толькі на ўсход.

У эшалон з эвакуіраванымі ўмасцілася і сям'я Паньковай. Мабыць, толькі маленькі Сашка нічога не адчуваў, ён смактаў сабе матчыны грудзі і часам заходзіўся плачам. А большыя Святлана і Наташка, зашыўшыся ў куток таварнага вагона, сядзелі, як напалоханыя зайчаняткі. Матчына сэрца аж разрывалася ад болю за дзяцей. Каб яна была адна, дык што там: дзе пераднявуў, дзе пераначаваў, галодны ці халодны, дык не такая і бяда. А то ж трэба ратаваць дзяцей, і калі па дарозе наляталі фашысцкія сцярвятнікі, бамбілі і расстрэльвалі з кулямётаў эшалоны з бежанцамі, дык яна, падаючы, шукаючы ў зямлі ратунку, падграбала пад сябе дзяцей: калі і падзе якая куля, ці асколак бомбы, дык яна сваім жыццём прыкрые іхняе.

Дарога гэтак сцеглася, што, здавалася, яны ехалі ўсё сваё жыццё, быццам ужо не было ні Гомеля, ні дэпо. Часам цэлымі суткамі стаялі на забітых эшалонамі станцыях, і самым страшным здавалася неба, тое самае неба, у якое Алена яшчэ не так даўно любіла ўглядацца—уночы на зоркі, а ўдзень у ясны блакіт яго. Цяпер кожная чорная кропка, якая з'яўлялася ў небе, здавалася чорным вестуном смерці, хоць пра смерць і не хацелася думаць, напускаць на душу пануласці. Алене ўспомнілася сваё маленства, якое таксама пачалося бежанствам, і на сэрцы закіпала такач злосць, што каб яе можна было выплескнуць на тых, хто ўшчынае войны, дык нядоўга б яны патрывалі. Аднак жа одум, балючая скруха будзілі неўтаймоўнае жаданне нешта рабіць такое, што дало б карысці Радзіме, народу ў зацятай барацьбе з фашызмам.

Эшалон спыніўся на станцыі Абдуліна Куйбышаўскай чыгункі. Сяк-так уладкаваўшыся з дзецьмі, Алена пайшла да начальства.

— Давайце работу, не магу я сядзець склаўшы рукі.

Майстар паравознага дэпо Барыс Мікалаевіч Мананікаў спытаў у Паньковай, што яна можа рабіць, і калі Алена адказала, што яна электразваршчыца, дык у таго аж вочы пакруглелі.

— Электразваршчыца?—быццам не дачуўшы, перапытаў майстар.

— Так, электразваршчыца. А чаго вас такое дзіва бярэ?

— Як тут не здзівішся. Жанчына—электразваршчыца. У нашым дэпо ніхто не дасць веры.

— То ў вашым. А ў нашым даўно паверылі ўжо.

І хоць Алена ўпэўнена брала ў рукі электразварачны апарат, усё ж майстар пабаяўся даць ёй рабіць электразварку. Два тыдні яна правіла электроды. Па-тым, як Алена абыходзілася з электродамі, майстар пераканаўся, што яна сапраўды электразваршчыца, і на спробу даручыў ёй самастойную работу—зварваць сувязі ў паравознай топцы, паставіўшы на ўсякі выпадак поруч з Аленай лепшага ў дэпо электразваршчыка. Працуючы, той раз-пораз кідаў вокам на Панькову: ці так яна варыць? Але неўзабаве пераканаўся, што тут няма чаго глядзець, няма чаго кантраляваць: Алена працавала не горш, а можа яшчэ лепш за яго. Дзіва што лепш! Гэта паказалі і падлікі пасля змены: яна наварыла больш на 21 сувязь.

Алену, калі яна бачыла, што электразваршчык з недаверам назіраў за яе працай, разбірала нейкая задзёрыстасць, нават зухаватасць, і яна сама сабе шаптала: «от я табе пакажу, як працаваць, ты ў мяне яшчэ паскачаш і паплачаш». І сапраўды мужчынскі і прафесіянальны гонар лепшага электразваршчыка паравознага дэпо быў зусім знішчаны.

Амаль кожны дзень Алена Панькова здзіўляла рабочых Абдулінскага дэпо. Неяк трэба было наварваць паравозныя колы. Для электразваршчыкаў работа гэта не была ў навіну. І хоць Алене ніколі не даводзілася наварваць паравозныя колы, усё ж яна вырашыла паспрабаваць наварваць выпрацаваныя мясціны не кожную асобным швом, а адным, суцэльным, гэтак жа, як яна наварвала вагонныя.

І выйшла: працэс наваркі колаў намнога скараціўся, а якасць яе палепшылася. Неўзабаве Аленінаму прыкладу паследавалі амаль усе абдулінскія электразваршчыкі. Для таго часу гэта было наватарскае пачынанне, цэлая рэвалюцыя ў працы.

Фронт штодзённа патрабаваў як мага больш паравозаў, баявой тэхнікі для барацьбы з фашысцкай навалаччу. І рабочыя абдулінскага дэпо вырашылі ўнесці сваю даніну: даць для фронта звышпланавы бронецягнік. Адным з ініцыятараў пабудовы бронецягніка была электразваршчыца Алена Данілаўна Панькова. Дванаццаць сутак брыгада амаль не выходзіла з дэпо. Алена варыла бранявыя пліты. Яна зрэдку толькі забягала дадому паглядзець, як там дзеці. Свякруха спрабавала нават бурчаць на нявестку:

— Што ты сабе думаеш: не ясі, не спіш, гэтак нядоўга і з ног звалішся. Іван там галаву можа скласці, а ты тут, і што я тады з дзецьмі буду рабіць. Я ж старая, хіба ж я дам ім ладу якога, калі ты, не давядзі бог, звалішся.

— Нічога, мама, са мною не станецца. Я цягавітая, выцягну. Вы толькі дзяцей глядзіце. Мы фронту, Івану нашаму памагаем фашыстаў біць.

Бронецягнік адпраўлялі на фронт урачыста: быў мітынг, нават граў аркестр. На бранявых плітах паравоза вялізнымі белымі літарамі было напісана: «Смерць фашызму!». Алене, калі яна слухала прамоўцаў, сама выступала на мітынгу, верылася, што імена гэты цягнік, бранявыя пліты якога яна варыла сваімі рукамі, паможа яе Івану ў баю, прыкрые, абароніць яго ад варожай кулі.

На ўсё жыццё запомніўся Алене Данілаўне Паньковай партыйны сход у Абдулінскім дэпо. Яна падыйшла да стала прэзідыума, у якім былі старэйшыя таварышы па дэпо, камуністы, і пачала расказваць пра сваё жыццё.

Адзін за адным выступалі камуністы і кожны гаварыў:

— Таварыш Панькова — дастойнае папаўненне радоў нашай партыі. Яна не шкадуе ні працы, ні сэрца для таго, каб наблізіць нашу перамогу.

Так, Алена Данілаўна мела права ўвайсці ў вялікую сям'ю камуністаў. Яна заваявала яго сваёй працай, адданасцю Радзіме, для росквіту якой яна не шкадавала і ніколі не пашкадуе нічога.

МЫ ІДЗЕМ павольна. Я стараюся разглядаць наваколле. Не пазнаю яго. Да вайны тут толькі былі карпусы Гомсельмаша, а далей быў пустыр, а яшчэ далей поле. Цяпер мы ішлі па асфальце паўз новыя карпусы завода, новымі вуліцамі.

— Гэта нашы сельмашаўскія, — з гонарам паведаміла Панькова. — Іх аж тры ў нас. А вунь і Палац культуры Гомсельмаша. Вы яго яшчэ, мабыць, не бачылі? — спытала Панькова.

— Не, не даводзілася.

Дом культуры Гомсельмаша сапраўды можна назваць палацам: вялізная, можа нават занадта, каланада, што на фоне домікаў індывідуальнай забудовы, здаецца нечым казачным. Алена Данілаўна не нахваліцца:

— Пакуль не было палаца, дык мы сядзелі тут, як дзікуны якія. А цяпер, дык ў нас тут і кіно, і лекцыі, і моладзі ёсць дзе патанцаваць. Адным словам, добра тут у нас, зацішна, а ўлетку, як на дачы.

Другі ад канца Трэцяй Сельмашаўскай вуліцы домік гэта і ёсць жытло Паньковай. Домік невялікі, але дагледжаны, як лялька. У чатырох пакоях яго ўтулька, цёпла, светла. Нічога лішняга, усё па-рабочаму проста. На покуце шырокая этажэрка з кнігамі. У мяне здавён выпрацавалася звычка: як толькі заходжу ў хату, паглядзець на кнігі, пагартаць каторыя з іх, бо па тым, што чалавек чытае, можна вызначыць, што ён за чалавек.

У той час, калі я разглядаў на этажэрцы кнігі, у дом зайшла дзяўчына, відаць, суседка Паньковай.

— Цёця, што мне ўзяць пачытаць у вас?—

— Паглядзі там. Горкага бяры, калі не чытала або Віктара Гюго... Я і сама люблю пачытаць, — казала ўжо да мяне Алена. — Кнігі для мяне, што хлеб. Цяпер от мне Святланка памагае выбіраць кнігі. Яна ж вучыцца на факультэце філалогіі, дык ведае, што параіць. Каторую кнігу чытаеш, дык усё роўна, што сам з героямі яе жывеш, а другую прачытаеш і назаўтрае забудзеш. Мабыць, гэта таму так бывае, што той пісьменнік, кнігу якога чытаеш і чытаць хочацца, усё тое, пра што напісаў, сам перажыў, вынасіў пад сэрцам, дык яго хочацца і чытаць. А другі напісаў, як той рамеснік. Ды яно ў кожнай справе так бывае, нават у нашай электразварцы: калі будзеш працаваць, не аддаючы душы, дык у цябе і клеіцца не будзе. Мо' план і будзеш выконваць, але высока не ўзляціш. А на маю думку, што б ты ні рабіў, асабліва тую работу, якая табе да спадобы, дык у яе трэба ўкладваць душу. Вось гэта і будзе па-камуністычнаму.

Алена Данілаўна доўга расказвала пра сваю працу ў дэпо, пра тое, як яна сваім прыкладам нікому не дае застойвацца на адным месцы.

— От, здаецца, ужо ўсё добра, лепш і быць не можа, а прыйду дадому ды падумаю, дык можна ж і яшчэ лепш. На мяне нашы дэпоўскія электразваршчыкі дык часам нават злуюць. Быту я ім не даю. Нават Іван мой і той часцяком папракне: хіба табе больш за ўсіх трэба, што ты навыперадкі перад усімі ірвешся? А я яму і кажу на гэта: так, мне і табе, усім нам больш за ўсіх трэба, бо мы ж камунізм будаваць узяліся, а як жа ты яго пабудуеш, калі ў рабоце, як муха па смале, будзеш цягнуцца.

Гляджу я, а мой Іван распытвае ўжо ў мяне, як тое ды тое рабіць, значыцца, хоча дагнаць мяне. Мы гэтак з ім жывём і працуем, як бы адно перад адным навыперадкі бегаем.

Алена Данілаўна на момант задумалася, быццам нешта важнае асэнсоўваючы, і сказала:

— А ведаеце, мне часта чамусьці прыходзіць у галаву думка: адзін чалавек, здаецца, у такім моры людскім нічога і не значыць. Але ж, як падумаеш лепш, дык гэта няпраўда. Калі ў чалавека душа гарыць, калі ён усім сэрцам імкнецца зрабіць, як мага больш для сваёй краіны, дык ён вялікая сіла. Я сказала б, ён тая іскра, з якой разгараецца вялізнае, зыркае полымя. А як добра чалавеку быць іскрай, запальваць маякі, значыць, шляхі будучыні.

Я глядзеў на Алену Данілаўну і бачыў, як у яе глыбокіх вачах люстравалася думка, якую яна вось-вось павінна выказаць. І мне чамусьці прыходзіла ў галаву: не, гэта не тая работніца, якая адно дбае, як бы зарабіць на пракорм дзяцей, сабе на пражытак. Перада мной была тая работніца, у клопаце якой, у працы ляжыць творчы пачатак. Часта бывае і так, што ў некаторых людзей стымулам да працы з'яўляецца імкненне нечым вызначыцца, паказаць сябе, бліснуць. У Паньковай жа кіруючым пачаткам з'яўляецца зусім іншае: яна дбае пра тое, каб як найбольш зрабіць для краіны, для народа, унесці сваю даніну ў яго тытанічную працу па будаўніцтву камунізма. Яна сціплая ў працы і ў паводзінах, і калі заходзіць гаворка пра яе працу, абавязкова скажа: хіба я адна такая, працую, як і ўсе, у каго ёсць жаданне, ёсць спрыт. Чалавеку перш за ўсё трэба мець гарачае жаданне і ён можа дасягнуць любой мэты, калі яна не фантастычная.

Вось чаму, калі на Гомельскай абласной партыйнай канферэнцыі выбіраліся дэлегаты на XXI нечарговы з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, камуністы Гомеля назвалі імя Алены Данілаўны Паньковай. Яна нават вушам сваім не паверыла, што назвалі яе імя, і аж перапытала ў таго, хто сядзеў з ёй поруч:

— Хто, хто?

— Нейкая Панькова.

— Не можа быць, — і Алена сама не ведае ад чаго зацвіла, як макаў цвет.

— Завошта? — запытала сама ў сябе.

У гэты момант у памяці прамільгнула ўсё яе немалое жыццё і ёй здавалася, што яна нічога асаблівага не зрабіла, адно працавала, як ёй падказвала яе рабочае сумленне. Тое, што за год выконвала і выконвае па паўтары — дзве нормы здавалася ёй звычайным, нават абыдзённым. А людзі ўгледзелі ў гэтым гераізм.

Алена Данілаўна ў Вялікім Крамлёўскім палацы, куды сабраўся ўвесь цвет партыі, народа. Сама сабе яна чамусьці здалася маленькай, маленечкай, ну, як парушынка. Але потым, калі выступіў з дакладам Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў і пачаў гаварыць пра ролю простых людзей, рабочых і работніц, у выкананні сямігадовага плана, які наблізіць нашу краіну да камунізма, яна адчула, што ён гаворыць і пра яе, простую работніцу Гомельскага вагоннага дэпо. І дзіва дый годзе: прагала тая ніякаватасць, якая была ў першыя дні. Яна адчула сябе ўпоравень з усімі: з вядомымі краіне партыйнымі кіраўнікамі, з наватарамі вытворчасці.

Неяк у перапынку да яе падыйшоў славуты на ўсю краіну шахцёр данбасавец Мамай.

— Вы з Беларусі? — папытаў ён. — Вагоны рамонтуеце, на ногі, так сказаць, ставіце?

— Так, з Беларусі. З Гомеля, — адказала Алена.

— Ну, то давайце нам больш вагонаў, а мы будзем даваць больш вугалю. От мы так з вамі і дамовімся: будзем спаборнічаць.

— Я згодна, таварыш Мамай.

Потым ў Гомелі, выступаючы перад рабочымі са справаздачай аб рабоце з'езду, Панькова неяк інакш глядзела і на работу свайго дэпо, і на свой родны горад. Яна ўсё ўбачыла нібы ў інакшым святле, у рэчышчы тых агульных задач, якія выконвае краіна. На партыйных бюро, на нарадах, на рабочых сходах яна сурова крытыкавала кожны, нават драбнейшы недахоп. Гэта мо' каму і не падабалася, але ніхто не мог запярэчыць, бо сама Панькова паказвала прыклад камуністычных адносін да працы.

Летась, акурат перад Днём жанчын, Алене Данілаўне пазвалі з абкома партыі і сказалі, каб яна збіралася ў дарогу ехаць, у Маскву на свята.

І вось зноў Вялікі Крамлёўскі палац. На гэты раз яго запоўнілі жанчыны. Іх было многа-многа, з усяе краіны. Гэта ўсе тыя, хто паказвае ўзоры працы.

Чыталі Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні лепшым жанчынам высокага звання Героя Сацыялістычнай Працы. Сярод тых, хто ўдастоіўся гэтага высокага звання, была і Алена Данілаўна Панькова.

— Я не ведаю, на якім свеце была, калі пачула сваё імя ва Указе. Мне ўсё здавалася, што гэта памылкова. Я ж нічога такога не зрабіла, — гаворыць мне Алена Данілаўна, і я адчуваю, што гэта не рысоўка, не штучная дэманстрацыя чалавечай сціпласці перад карэспандэнтам.

— А потым быў канцэрт, іграла музыка, танцавалі ўсе разам: і мы, жанчыны, і кіраўнікі нашай партыі і краіны. Я дык аж сумелася, якія яны ўсе простыя, сардэчныя, асабліва Мікіта Сяргеевіч. Ён дык гатоў быў з кожнай з нас пагаварыць, пажартаваць. Ды вунь, зірніце самі, — сказала Алена, пабегла ў другі пакой і прынесла загорнутыя ў матэрыю два вялізныя здымкі.

— А навошта вы іх хаваеце ад людскога вока?

— Гэта памяць на ўсё жыццё. А калі я павешу на сцяну, дык яны запыляцца і могуць папсавацца.

На здымках я ўгледзеў: на адным—дэлегацыю Камуністычнай партыі Беларусі на XXI нечарговым з'ездзе КПСС разам з кіраўнікамі партыі і ўрада, і на другім — кіраўнікоў партыі і ўрада сярод жанчын на ўрачыстасці, прысвечанай 80 годдзю Міжнароднага жаночага дня. Я ніяк не мог знайсці: дзе ж Алена Данілаўна.

— Вы, мусіць, мяне не пазнаеце. Во ж я, — і Панькова паказала на жанчыну ў першым радзе, другую ад Мікіты Сяргеевіча. — Поплеч з Мікітам Сяргеевічам Паліна Нікандраўна Кавалёва, старшыня калгаса на Гомельшчыне, а побач з ёю я. А вы ведаеце, як гэта атрымалася...

І Алена расказала мне, як пасля таго, калі ўзнагароджаным уручылі Залатыя Зоркі Герояў, жанчыны абступілі Мікіту Сяргеевіча. Вядома, кожнай хацелася з ім перакінуцца хоць словцам. Панькова ніяк не магла прабіцца блізка да таварыша Хрушчова і яна са скрухай у голасе сказала:

— От гэтыя ўвішныя жанчыны, дык і наглядзецца не дадуць на Мікіту Сяргеевіча.

Словы Паньковай, мусіць, дайшлі да Мікіты Сяргеевіча, бо Алена пачула:

— Хто гэта там на мяне, такога кавалера, наглядзецца хоча?

— Гэта вунь адна беларуска, — адказвалі жанчыны...

— О, калі беларуска, дык і я магу закахацца, харошыя жанчыны беларускі. Я ведаю іх, яны працалюбівыя і, галоўнае, сціплыя.

Гэтак Панькова і пазнаёмілася з Мікітам Сергеевічам. А потым, калі садзіліся фатаграфавацца з кіраўнікамі партыі і ўрада, да Алены Данілаўны падыйшоў чалавек і сказаў ёй:

— Мікіта Сяргеевіч хоча, каб вы былі ў першым радзе.

Алена Данілаўна беражэ гэтыя два здымкі, і калі і паказвае каму, дык не для таго, каб пахваліцца сваім высокім знаёмствам. У тым факце, што яна, простая работніца, электразваршчыца з Гомельскага вагоннага дэпо, сфатаграфавана разам з кіраўнікамі партыі і ўрада, Панькова бачыць канкрэтнае выяўленне вялікага адзінства партыі і народа.

Яно так і ёсць! Ва ўсім і ўсюды відаць гэтае адзінства: і ў тым, што Мікіта Сяргеевіч аб'ездзіў усю краіну, каб параіцца з калгаснікамі і рабочымі, як нам лепш працаваць, як хутчэй заваяваць вышыні камунізма; і ў тым, што вось іх, сотні жанчын, сабралася з усяе краіны ў Крамлёўскі палац і адчуваюць сябе тут, у гэтых высокіх гасцях, як дома; што яны не толькі слухаюць кіраўнікоў партыі і ўрада, але і самі раяць, падказваюць, як лепш зрабіць, каб наша краіна яшчэ больш дужэла, узыходзіла на зіхотныя вяршыні камуністычнай будучыні.

Як жа гэтаму не радавацца! Як ад усяго гэтага не заспявае сэрца! Як для такой краіны пашкадуеш самога сябе, свае працы, свайго розуму, свайго сэрца!

УДЗЕНЬ і ўначы над дэпо блакітнае ззянне электразваркі. Краіне патрэбна ўсё больш і больш вагонаў. Сталёвыя магістралі Радзімы павінны спяваць пад іх коламі безупынна, штодзень, штоноч. І Алена Данілаўна робіць усё для таго, каб як найхутчэй, найлепш рамантаваць вагоны. Прыкладам свае гераічнай працы яна кліча другіх за сабою. Яе рукі, яе дапытлівы розум не ведаюць утомы. Яны шукаюць і знаходзяць усё новыя і новыя спосабы і метады працы. І не дарма рабочыя дэпо ў адзін голас сказалі, што Алена Данілаўна Панькова — іх першы ўдарнік камуністычнай працы.

На сходзе рабочых, прысвечаным абмеркаванню абавязацельстваў у сувязі з падрыхтоўкай да XXII з'езду КПСС, Алена Панькова выступіла перад усімі і сказала:

— Я, таварышы, абавязваюся да пачатку работы дваццаць другога з'езду нашай роднай партыі выканаць сваю сямігодку.

І ні ў кога не ўзнікла і на момант сумнення, што яна зробіць гэта. Усе ведаюць, што Герой Сацыялістычнай Працы Алена Данілаўна Панькова ніколі не кідала слоў на вецер. Яе слова — гэта слова камуністкі, слова, якое ідзе ад чыстага, шчырага сэрца.

Калі я гляджу на блакітнае ззянне электразваркі, мне здаецца, што гэта так прыгожа ззяе душа жанчыны-працаўніцы, чыя праца стала подзвігам.

Няхай жа ззяе, ніколі не меркнучы на тваіх грудзях, дарагая Алена Данілаўна, Залатая Зорка славы. Я ведаю, што то ззяе не толькі золата зоркі, то ззяе душа чалавека камуністычнага часу.

ФІЛЬМЫ Ў КРАСАВІКУ

Па сцэнарыю старэйшага савецкага кінадраматурга С. Ермалінскага на кінастудыі «Масфільм» знята кінакарціна «Пачатак веку» (рэжысёр А. Рыбакоў), прысвечаная стварэнню Ул. І. Леніным першай рускай марксісцкай газеты «Искра». Ролю Уладзіміра Ільіча выконвае артыст Юрый Каюраў. Гэ